STRENGTHENING
**CIVIL SOCIETY**
GLOBALLY



# ІНДЭКС УСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ - 2019

БЕЛАРУСЬ

КАСТРЫЧНІК 2020

USAID FROM THE AMERICAN PEOPLE

ICNL INTERNATIONAL CENTER FOR NOT-FOR-PROFIT LAW

fhi360 THE SCIENCE OF IMPROVING LIVES

# ІНДЭКС УСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ – 2019

## КРАІНЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І ЎСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ І ЕЎРАЗІІ, БЕЛАРУСЬ


**Складальнікі:**

Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці

Бюро па справах дэмакратыі, канфліктах і гуманітарнай дапамозе Цэнтр перадавога вопыту ў галіне дэмакратыі, правоў чалавека і кіравання



Гэтае выданне стала магчымым дзякуючы падтрымцы Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці ў межах Пагаднення аб супрацоўніцтве № AID-OAA-LA-17-00003.


**Фота на вокладцы:** прадстаўнікі Моладзевага банка ініцыятыў горада Беразань (Кіеўская вобласць) прадстаўляюць свае дасягненні на Форуме развіцця грамадзянскай супольнасці Украіны. Форум, які штогод ладзіцца арганізацыяй «Єднання» пры падтрымцы USAID, − гэта найбуйнейшая платформа для навучання і абмену досведам сярод арганізацый грамадзянскай супольнасці Украіны, якая аб'ядноўвае каля 2500 прадстаўнікоў некамерцыйнага і прыватнага сектара, донарскай супольнасці, СМІ і дзяржаўных органаў.


***Дысклэймер:** усе меркаванні, выказаныя ў гэтым дакуменце, з'яўляюцца асабістым пунктам гледжання экспертаў, якія ўдзельнічалі ў ацэнцы Індэкса і падрыхтоўцы справаздачы, і не абавязкова адлюстроўваюць кропку гледжання USAID або FHI 360.*

# ЗМЕСТ

**Уводзіны**.....................................................................................................3

**АГС у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі**.....................4

**Устойлівасць арганізацый грамадзянскай супольнасці Беларусі ў 2019 годзе**...................................................................................... ..24

Прававы асяродак.................................................................. 25

Арганізацыйны патэнцыял ...................................................... 28

Фінансавая ўстойлівасць......................................................... 31

Адвакатаванне....................................................................... 34

Аказанне паслугаў.................................................................. 36

Інфраструктура сектара.......................................................... 38

Грамадскі імідж...................................................................... 40

# УВОДЗІНЫ

Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці (USAID) прадстаўляе дваццаць трэцяе выданне *Індэкса ўстойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці* (CSOSI), якое апісвае тэндэнцыі і змены ў развіцці сектара АГС у 2019 годзе.

У гэтым годзе Індэкс па краінах рэгіёну Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі, у які ўваходзіць Беларусь, змяшчае справаздачы па стане сектара АГС у 24 краінах: ад Прыбалтыкі на поўначы да Каўказа на поўдні і ад краін Вышаградскай групы на захадзе да Расіі, якая цягнецца на ўсход да Ціхага акіяна. Індэкс аналізуе як поспехі, так і няўдачы ў фармаванні ўстойлівасці АГС па сямі ключавых параметрах: прававое асяроддзе, арганізацыйны патэнцыял, фінансавая ўстойлівасць, адвакатаванне, аказанне паслугаў, інфраструктура сектара і грамадскі імідж. Індэкс прызначаны стаць карыснай крыніцай інфармацыі для мясцовых АГС, дзяржаўных органаў, донараў, акадэмічнай супольнасці і іншых зацікаўленых бакоў, якія хочуць лепш разумець і развіваць ключавыя аспекты ўстойлівасці сектара.

Метадалогія Індэкса абапіраецца на дадзеныя, якія прадстаўляюцца практыкамі і даследчыкамі АГС, якія ў кожнай краіне ствараюць экспертную групу для ацэнкі сямі параметраў устойлівасці АГС за год. Экспертная група ўзгадняе балы па кожным параметры ад 1 (устойлівасць высокая) да 7 (устойлівасць нізкая). Затым падлічваецца сярэдняя велічыня па ўсіх выстаўленых балах і атрымліваецца агульны бал устойлівасці АГС у кожнай краіне. Рэдакцыйная калегія, якая базуецца ў ЗША і складаецца з тэхнічных і рэгіянальных экспертаў, рэцэнзуе балы кожнай экспертнай групы і адпаведныя апісальныя справаздачы з мэтай захавання аднастайнасці падыходаў і стандартаў для параўнання сітуацыі ў розных краінах.

Больш падрабязна пра метадалогію, якая выкарыстоўваецца для разліку балаў і складання справаздач, можна даведацца ў поўнай версіі Індэкса на англійскай мове на сайце FHI360.

*Індэкс устойлівасці АГС краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі* дапаўняе аналагічныя публікацыі па іншых рэгіёнах: *Індэкс устойлівасці АГС краін Афрыкі на поўдзень ад Сахары* ацэньвае сектар грамадзянскай супольнасці ў 32 краінах; *Індэкс устойлівасці АГС краін Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі* ахоплівае 8 краін; *Індэкс устойлівасці АГС краін Азіі* ўключае справаздачы па 10 краінам. Акрамя таго, Індэкс ацэньваецца ў Мексіцы. Такім чынам, усе выданні Індэкса ўстойлівасці АГС у 2019 годзе змяшчаюць інфармацыю агулам па 74 краінах.

# АГЛЯД СІТУАЦЫІ Ў КРАІНАХ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ І ЕЎРАЗІІ Ў 2019 ГОДЗЕ

*Індэкс устойлівасці АГС* у 2019 годзе для дваццаці чатырох краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі адлюстроўвае развіццё падзей у 2019 годзе ў сямі ключавых вымярэннях, якія ўплываюць на ўстойлівасць сектара АГС. У 2019 годзе АГС у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і Еўразіі працягвалі адчуваць уплыў важных палітычных падзей, уключаючы выбары і змены ва ўрадах, палітычны параліч і пратэсты, а таксама рэагаваць на іх. Нягледзячы на такі нярэдка турбулентны палітычны кантэкст, сектар АГС дасягнуў у шэрагу краін прыкметных поспехаў у адвакатаванні, аказанні паслугаў і фінансавай эфектыўнасці. У той жа час АГС у многіх краінах працягвалі адчуваць негатыўнае стаўленне з боку дзяржаўных чыноўнікаў, палітыкаў і СМІ, што часта наносіла шкоду іх грамадскаму іміджу.

Гэтыя падзеі ў значнай ступені застаюцца ў рэчышчы тэндэнцый, што ўплывалі на ўстойлівасць АГС у рэгіёне апошнія некалькі гадоў. Аднак свет рэзка змяніўся з канца 2019 года, калі эпідэмія новага каранавіруса стала глабальнай. Гэта стварае адчуванне кагнітыўнага дысанансу паміж апісанай у справаздачах сітуацыяй і сённяшнімі рэаліямі. Індэкс за 2020 год будзе адлюстроўваць карэнна іншыя ўмовы існавання АГС. Паколькі пандэмія сур'ёзна паўплывала на эканоміку, чакаецца рэзкае зніжэнне фінансавай жыццяздольнасці. У сваю чаргу, гэта можа разбуральна ўздзейнічаць і на іншыя аспекты ўстойлівасці, уключаючы арганізацыйны патэнцыял. Напрыклад, АГС маюць менш сродкаў для ўтрымання персаналу, выканання сваіх задач і ўзаемадзеяння са сваімі мэтавымі аўдыторыямі. Адвакатаванне таксама значна ўскладнілася ў 2020 годзе, паколькі новыя патрабаванні сістэмы аховы здароўя не дазваляюць арганізаваць вялікія сходы, а прыярытэты заканадаўчых органаў сканцэнтраваныя на праблемах, звязаных з пандэміяй. У той жа час попыт на паслугі АГС – як у сферы аховы здароўя, так і ў сферы сацыяльных і эканамічных наступстваў пандэміі – відавочна павялічыўся.

Аднак у 2019 годзе ніхто яшчэ не думаў пра сусветную пандэмію. Ніжэй асвятляюцца некаторыя тэндэнцыі, якія назіраліся ў свеце да пандэміі.

## ВАЖНЫЯ ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАДЗЕІ

У шэрагу краін у 2019 годзе адбыліся значныя палітычныя падзеі, у цэнтры якіх часта былі АГС.

Ва Украіне адбыліся істотныя палітычныя змены, калі прэзідэнтам быў абраны Уладзімір Зяленскі, акцёр без аніякага палітычнага досведу. За некалькі месяцаў да прэзідэнцкіх выбараў Зяленскі сфармаваў новую палітычную партыю, якая атрымала большасць на датэрміновых парламенцкіх выбарах, што прайшлі ў ліпені 2019 года. Урад быў сфармаваны людзьмі, якія пераважна не мелі практычнага досведу працы на выбарных пасадах ці ў сістэме дзяржаўнага кіравання, уключаючы некаторых грамадзянскіх актывістаў. Урад і новы прэзідэнт Украіны праводзілі праеўрапейскую палітыку і дэмакратычныя рэформы. АГС актыўна назіралі за выбарамі і выступалі за выбарчую рэформу цягам года. У лістападзе больш за 400 кіраўнікоў нацыянальных і рэгіянальных АГС, аналітычных цэнтраў і кааліцый з усёй краіны сустрэліся з уладамі ў Кіеве на двухдзённай канферэнцыі PlatForum, прысвечанай паскарэнню праеўрапейскіх рэформаў ва Украіне.

У краінах Паўночнай групы каляндар выбараў быў вельмі насычаны. У дадатак да розных нацыянальных і мясцовых выбараў, у канцы траўня ва ўсіх краінах-сябрах Еўрапейскага Саюза (ЕС) адбыліся выбары ў Еўрапейскі парламент.

У Славакіі ў сакавіку была абрана першая жанчына-прэзідэнтка Зузана Чапутава, грамадзянская актывістка і юрыстка пазапарламенцкай партыі “Прагрэсіўная Славакія”.

У тым жа месяцы ў Эстоніі прайшлі парламенцкія выбары. Кіруючая Партыя рэформаў зноў набрала большасць месцаў, аднак яна не здолела сфармаваць урад. У рэшце рэшт парламент ухваліў кааліцыйны ўрад, сфармаваны Партыяй цэнтра, кансерватыўнай партыяй “Ісамаа” і ўльтраправай Кансерватыўнай народнай партыяй Эстоніі (EKRE). Новы ўрад быў менш прыязны да АГС і адкрыта крытыкаваў арганізацыі, якія працуюць з праблемамі меншасцяў і правамі жанчын.

Нацыянальныя выбары прайшлі таксама ў Польшчы. Праводзячы папулісцкую стратэгію падчас выбарчых кампаній, кіруючая партыя "Права і справядлівасць" (PiS) вінаваціла супольнасць лесбіянак, геяў, бісексуалаў, трансгендараў і інтэрсексуалаў (ЛГБТІ), а таксама судовую сістэму ў розных праблемах краіны, што негатыўна паўплывала на АГС, якія працуюць у гэтых сферах.

На працягу года ў Літве выбары адбыліся тройчы: мясцовыя ў сакавіку, прэзідэнцкія і еўрапейскія ў траўні. Вынікі выбараў паказваюць, што на сённяшні дзень Літва ў асноўным пазбегла хвалі папулізму і еўраскептыцызму, што назіраюцца ў большай частцы Еўропы.

У Венгрыі кіруючая партыя "Фідэс" перамагла на еўрапейскіх выбарах, аднак мясцовыя выбары ў кастрычніку прынеслі нечаканыя вынікі. Аб'яднаныя кандыдаты ад апазіцыі перамаглі не толькі ў Будапешце і ў большасці з яго дваццаці трох раёнаў, але і ў палове найбуйнейшых гарадоў краіны, а таксама ў шэрагу меншых населеных пунктаў. АГС і грамадскія групы актыўна ўдзельнічалі ў правядзенні мясцовых выбараў, і гэтыя новыя ўрады паказалі сябе больш адкрытымі да супрацоўніцтва з АГС.

У той жа час некалькі краін на Балканах былі паралізаваны палітычнымі канфліктамі. У Чарнагорыі байкот парламента цягнуўся большую частку 2019 года. АГС прымалі ўдзел у захадах, падтрыманых ЕС, па аднаўленні палітычнага дыялогу і рэфармаванні выбарчага і іншага заканадаўстваў у рамках падрыхтоўкі да парламенцкіх выбараў, якія павінны былі адбыцца 30 жніўня 2020 года. Аднак гэтыя намаганні не змаглі дасягнуць якіх-небудзь канкрэтных вынікаў. Гэтак жа ў Сербіі пяцьдзясят пяць з васьмідзесяці васьмі дэпутатаў ад апазіцыйных партый байкатавалі парламент на працягу года ў знак пратэсту супраць таго, што кіруючая партыя сабатавала парламенцкія дэбаты. Пасля таго, як ключавыя апазіцыйныя партыі абвясцілі, што плануюць байкатаваць выбары 2020 года, АГС і Еўрапейскі парламент арганізавалі шэраг дыялогаў паміж апазіцыяй і кіруючымі партыямі з мэтай прыняць і рэалізаваць змены, якія забяспечылі б свабоднае і справядлівае галасаванне. Аднак, нягледзячы на некаторыя пазітыўныя моманты, перамовы не прынеслі чаканых вынікаў. Нацыянальныя выбары прайшлі ў Босніі і Герцагавіне ў кастрычніку 2018 года, але ўрады на многіх узроўнях не былі сфармаваныя ў 2019 годзе, паколькі палітычныя перамовы зайшлі ў тупік. У выніку АГС сутыкнуліся з цяжкасцямі ў ажыццяўленні сваіх ініцыятыў і прапаноў. У Албаніі пасля шматмесячных антыўрадавых пратэстаў і жорсткай палітычнай палярызацыі апазіцыя байкатавала мясцовыя чэрвеньскія выбары, што дазволіла кандыдатам ад пануючай Сацыялістычнай партыі балатавацца на безальтэрнатыўнай аснове ў многіх раёнах краіны. Пазачарговыя выбары былі арганізаваны ў Косаве і Румыніі. У Косаве кіруючая кааліцыя знаходзілася ў складаным становішчы на працягу года праз непаразуменні паміж партнёрамі па кааліцыі. У ліпені прэм'ер-міністр Харадзінай падаў у адстаўку пасля таго, як Спецыяльны трыбунал па ваенных злачынствах у Гаазе выклікаў яго на допыт у якасці падазраванага. У жніўні парламент прагаласаваў за

самароспуск, а ў кастрычніку прайшлі пазачарговыя выбары. Хоць выбары прайшлі адносна без парушэнняў, канчатковыя вынікі не зацвярджаліся цягам трох месяцаў. У выніку кіруючую кааліцыю сфармавала былая апазіцыйная партыя "Vetevendosje!" і Дэмакратычная ліга Косава. Палітычная палярызацыя і змена кіруючых партый пасля выбараў ускладніла для АГС працэс рэалізацыі сваіх мэтаў на ўзроўні парламенцкіх камітэтаў, фракцый і партый.

Палітычная сітуацыя ў Румыніі была няўстойлівай: два туры выбараў, нацыянальны рэферэндум, які тычыўся рэформы судовай сістэмы, і дзве спробы імпічменту ўрада, адна з якой была паспяховай. Пасля імпічменту ўрада Ліберальная партыя сфармавала кабінет міністраў. Супрацоўніцтва АГС з папярэднім урадам ішло складана, у тым ліку, па прычыне недахопу даверу, які ўсталяваўся яшчэ з 2017 года. Аднак пасля фармавання ў кастрычніку новага ўрада павялічылася як празрыстасць, так і ўзровень удзелу АГС у працэсе прыняцця рашэнняў.

У шэрагу краін Еўразіі у 2019 годзе таксама адбыліся драматычныя палітычныя падзеі. На працягу года ў Малдове кіравалі тры розныя ўрады. Парламенцкія выбары ў лютым былі першымі, арганізаванымі па змешанай выбарчай сістэме, пры якой пяцьдзясят дэпутатаў выбіраліся па партыйных спісах, а астатнія пяцьдзясят адзін – мажарытарным галасаваннем. Пасля выбараў адбыўся трохмесячны перыяд перамоў аб фармаванні ўрадавай кааліцыі. Дэмакратычная партыя Малдовы (PDM), якая кіравала краінай падчас перамоў, спачатку адмовілася прызнаць новы ўрад, але ў рэшце рэшт прыняла яго, дазволіўшы кааліцыйнаму ўраду заняць кіруючыя пасады. Аднак новы кааліцыйны ўрад быў адпраўлены ў адстаўку пасля таго, як парламент абвясціў яму вотум недаверу ў лістападзе. Быў створаны яшчэ адзін урад пры падтрымцы Сацыялістычнай партыі і PDM, які кіраваў да канца года. АГС актыўна назіралі за выбарамі і дзейнасцю трох урадаў.

У Беларусі таксама праходзілі парламенцкія выбары, але апазіцыйныя кандыдаты і прадстаўнікі дэмакратычных АГС не змаглі атрымаць аніводнага месца.

У Грузіі ўдзельнікі антыўрадавых пратэстаў заблакавалі галоўны праспект сталіцы на некалькі месяцаў пасля таго, як расійскі дэпутат, які прыбыў з візітам у краіну, сеў у крэсла спікера грузінскага парламента, каб выступіць перад гасцямі Міжпарламенцкай асамблеі па праваслаўю. Многія расцанілі гэта як абразу грузінскага суверэнітэту, асабліва ў святле таго, што Расія захоўвае ваенную прысутнасць на дзвюх тэрыторыях, што знаходзяцца пад кантролем непрызнаных сепаратысцкіх рэспублік. Тысячы людзей выйшлі

на вуліцы, каб запатрабаваць адстаўкі ключавых чыноўнікаў. У выніку спікер парламента Грузіі падаў у адстаўку, але гэтага не хапіла для разрадкі сітуацыі, і пратэсты аднавіліся ў канцы года. Гэтыя падзеі выклікалі беспрэцэдэнтную грамадзянскую актыўнасць у выглядзе грамадскіх рухаў, нефармальных арганізацый і прыцягнення ў грамадскую дзейнасць новых людзей.

Выбары ў Маскоўскую гарадскую думу, што адбыліся ў верасні, прайшлі ў напружанай атмасферы. Пасля таго, як улады не зарэгістравалі незалежных кандыдатаў ад апазіцыі, адбыліся шматлікія акцыі пратэсту. Яны былі жорстка разагнаны паліцыяй, і тысячы дэманстрантаў былі арыштаваныя. Як ні дзіўна, пасля пратэстаў Следчы камітэт Расіі замест разгляду спраў аб гвалтоўных дзеяннях паліцыі, распачаў справы аб гвалце ў дачыненні да супрацоўнікаў паліцыі, асудзіўшы па стане на студзень 2020 года 18 чалавек.

## АДВАКАТАВАННЕ АГС РАЗВІВАЕЦЦА

Адвакацыйная дзейнасць АГС была асабліва паспяховай сярод краін, якія разглядаюцца ў Індэксе устойлівасці АГС у 2019 годзе для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі. Дзесяць краін, з іх тры краіны Паўночнай групы (Венгрыя, Літва і Славенія), чатыры з Паўднёвай групы (Харватыя, Косава, Паўночная Македонія і Румынія) і тры з Еўразіі (Арменія, Азербайджан і Грузія), паведамляюць пра паляпшэнне сваіх паказчыкаў па адвакатаванні.

Некалькі краін з ужо дастаткова высокім узроўнем патэнцыялу адвакатавання паведамілі аб далейшым паляпшэнні ў гэтай сферы ў 2019 годзе. Так, у Літве сектар, які займаецца актыўнай адвакацыйнай дзейнасцю, сканцэнтраваўся на рэформе заканадаўства аб АГС і атрымаў новае прадстаўніцтва ў органах, якія прымаюць рашэнні, у тым ліку, месцы для сваіх дэлегатаў у саветах рэгіянальнага развіцця. Літва павысіла бал, і цяпер мае найлепшы паказчык у сферы адвакатавання сярод усіх краін, ахопленых рознымі рэгіянальнымі выданнямі Індэкса ўстойлівасці АГС. АГС у Славеніі таксама дэманструюць моцны адвакатыўны патэнцыял і далейшыя паляпшэнні ў 2019 годзе. На працягу года славенскія АГС стварылі шмат буйных адвакатыўных кааліцый і рэалізавалі некалькі паспяховых адвакатыўных кампаній, што паказала іх здольнасць хутка рэагаваць на ўзнікаючыя праблемы. Яскравы прыклад: кааліцыя з сямідзесяці АГС выступіла супраць прапановы Міністэрства працы, што пазбаўляла сацыяльнай дапамогі людзей, якія працуюць, але не атрымліваюць мінімальнага даходу. Намаганні кааліцыі былі паспяховымі, і ў выніку прапанова была адклікана. У Арменіі, чый рэйтынг у сферы адвакатавання

апошнія некалькі год зніжаўся ў межах катэгорыі "Высокая ўстойлівасць" (найвышэйшага ўзроўню ўстойлівасці), у 2019 годзе адбыліся значныя змены. Патэнцыял адвакатавання значна ўзмацніўся, паколькі АГС атрымалі больш магчымасцяў для ўзаемадзеяння з дзяржаўнымі чыноўнікамі. Некалькі паспяховых адвакатыўных ініцыятыў АГС зрабілі ўнёсак у фармаванне заканадаўства і грамадскага парадку дня.

Венгрыя паведаміла аб паляпшэнні ў сферы адвакатавання ў 2019 годзе пасля амаль дзесяцігадовых праблем з гэтым параметрам на фоне рэпрэсіўнай палітыкі ўрада і яго намаганняў абмежаваць грамадскую прастору. У той час як урад у цэлым працягваў варожа ставіцца да адвакатавання АГС, у 2019 годзе павялічылася грамадзянская актыўнасць, у тым ліку падчас мясцовых выбараў. У дакладзе адзначаецца, што поспехі актывізму падчас выбараў "унеслі пэўную надзею і аптымізм у вельмі складаную атмасферу, што можа стаць асновай для будучай мабілізацыі".

У Румыніі, Арменіі і Паўночнай Македоніі паляпшэнне адвакацыйнай дзейнасці ў 2019 годзе было звязана са зменамі ва ўрадах у гэтым альбо ў папярэднія гады. У Румыніі адвакацыйная дзейнасць палепшылася ў 2019 годзе, бо ўзровень празрыстасці і ўдзелу АГС у распрацоўцы палітыкі павялічыўся пасля з'яўлення новага ўрада ў кастрычніку. Гэта стала першым паляпшэннем аднаго з вымярэнняў устойлівасці АГС з 2016 года. Як адзначалася вышэй, армянскія АГС палепшылі свой патэнцыял у 2019 годзе пераважна таму, што ў іх было больш магчымасцяў узаемадзейнічаць з новымі дзяржаўнымі чыноўнікамі, якія прыйшлі да ўлады праз "Аксамітную рэвалюцыю" ў красавіку і траўні 2018 года. У Паўночнай Македоніі, дзе ў сярэдзіне 2017 года адбылася гістарычная змена ўрада, сфера адвакатавання таксама палепшылася ў 2019 годзе, бо новы ўрад быў больш схільны рэагаваць на дзейнасць і меркаванні грамадзянскай супольнасці, а АГС маглі больш актыўна ўдзельнічаць у працэсах прыняцця рашэнняў як у мясцовых адміністрацыях, так і ў цэнтральных органах дзяржаўнага кіравання.

У Азербайджане па-ранейшаму самы слабы ўзровень адвакацыйнай дзейнасці ў рэгіёне, але ў 2019 годзе ў гэтай сферы адбылося нязначнае паляпшэнне, паколькі АГС атрымалі больш магчымасцяў узаемадзейнічаць з урадам у распрацоўцы палітыкі, у тым ліку праз новыя каналы супрацоўніцтва паміж АГС і ўрадам. Напрыклад, пры Адміністрацыі Прэзідэнта быў створаны новы аддзел па супрацоўніцтве з АГС і медыя, якое АГС разглядаюць як патэнцыйна эфектыўны механізм для асвятлення сваіх праблем на самым высокім узроўні. Нягледзячы на гэта нязначнае паляпшэнне, АГС, якія

разглядаюцца ўрадам як арганізацыі, звязаныя з апазіцыяй або засяроджаныя на пытаннях аб палітычных зняволеных і карупцыі ва ўрадзе, усё яшчэ не могуць ажыццяўляць сур'ёзных адвакатыўных дзеянняў.

На працягу года ўзровень адвакацыйнай дзейнасці таксама палепшыўся ў Харватыі, Косаве і Грузіі: АГС ва ўсіх трох краінах удзельнічалі ў значных адвакатыўных рухах і адыгрывалі актыўную ролю ў фармаванні агульнанацыянальных дыскусій па надзённых праблемах, у прыватнасці, праблемах хатняга гвалту, заробкаў настаўнікаў, свабоды СМІ, судовых прызначэнняў, правоў чалавека і дыскрымінацыі меншасцяў.

## НЕВЯЛІКІЯ ПОСПЕХІ Ў АКАЗАННІ ПАСЛУГАЎ

У 2019 годзе таксама палепшыўся ўзровень аказання паслугаў АГС: сем краін, у тым ліку дзве з Паўночнай групы (Латвія і Літва), тры з Паўднёвай групы (Албанія, Косава і Паўночная Македонія) і дзве з Еўразіі (Малдова і Расія), паказалі лепшыя вынікі ў гэтым вымярэнні. У Літве, Паўночнай Македоніі і Малдове паляпшэнне, прынамсі часткова, было звязана з тым, што АГС пашырылі паслугі, якія яны аказваюць сваім кліентам. У Літве АГС пачалі прадстаўляць асабістых памочнікаў людзям з інваліднасцю. У Паўночнай Македоніі змены ў закон аб сацыяльнай абароне, якія былі прыняты ў траўні 2019 года, дазволілі аб'яднанням грамадзян прадстаўляць грамадскія паслугі, а грамадзянская супольнасць цяпер можа ўдзельнічаць у большай колькасці ініцыятыў, што задавальняюць грамадскія інтарэсы, асабліва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і сацыяльнай абароны. У Малдове ўсё большая колькасць АГС, асабліва таварыствы ўзаемнай выгады, дыверсіфікавалі свае паслугі ў 2019 годзе. Напрыклад, Асацыяцыя пчаляроў з Малдовы атрымала акрэдытацыю для правядзення майстар-класаў для пчаляроў і выдачы пасведчанняў аб навучанні, якія прызнаюцца дзяржаўнымі ўстановамі. Паляпшэнне аказання паслугаў у Албаніі было абумоўлена эфектыўным рэагаваннем АГС на землятрус у лістападзе. АГС хутка мабілізаваліся для забеспячэння прадуктамі харчавання і нехарчовымі таварамі, псіхалагічнай і сацыяльнай дапамогі і для іншых дзеянняў па аказанні дапамогі пацярпелым ад землятрусу.

Дзяржаўная падтрымка адыграла ключавую ролю ў аказанні паслугаў і спрыяла паляпшэнню гэтага аспекту ў шэрагу краін. У Літве дадзеныя 2018 года, апошняга года, па якім ёсць інфармацыя, паказваюць, што АГС атрымалі 6,7 % ад агульнага аб'ёму муніцыпальнага фінансавання дзяржаўных паслугаў, што на 1,5 % больш у параўнанні з папярэднім годам. У Косаве ўзровень

аказання паслугаў павялічыўся і праз тое, што Міністэрства працы і сацыяльнай дапамогі ўпершыню дазволіла двум АГС, якія аб’ядноўваюць прадстаўнікоў этнічнай меншасці, прапаноўваць сацыяльныя і сямейныя паслугі. У Расіі ўрад пашырыў спіс паслуг, якія маюць права на больш працяглую дзяржаўную падтрымку, тым самым умацаваўшы стабільнасць гэтых паслуг. У спалучэнні з паступовымі зменамі за апошнія некалькі гадоў гэта прывяло да паляпшэння ўзроўню аказання паслугаў.

Рост сацыяльнага прадпрымальніцтва быў фактарам паляпшэння ацэнкі аказання паслугаў у Латвіі і Літве. У Латвіі ў 2019 годзе былі створаныя дзевяноста чатыры сацыяльныя прадпрыемствы ў такіх сферах, як адукацыя, ахова здароўя і інфармацыйныя тэхналогіі. У Літве колькасць сацыяльных прадпрыемстваў у краіне павялічылася ў 2019 годзе больш чым удвая, дасягнуўшы шасцідзесяці пяці, галоўным чынам, у выніку фінансавання сацыяльнага бізнесу праграмай Еўрапейскага Саюза LEADER. Сацыяльнае прадпрымальніцтва таксама развіваецца ў іншых краінах рэгіёну, у тым ліку ў Албаніі, Арменіі, Чэхіі, Косаве, Малдове, Румыніі, Чарнагорыі, Польшчы, Румыніі, Расіі і Сербіі.

## ДАЛЕЙШЫ ПРАГРЭС У ФІНАНСАВАЙ УСТОЙЛІВАСЦІ

Фінансавая жыццяздольнасць ужо даўно з'яўляецца самым слабым аспектам устойлівасці АГС у рэгіёне. Хаця 2019 год не стаў выключэннем у гэтым плане, за апошнія некалькі гадоў у гэтай галіне быў дасягнуты важны прагрэс. У 2018 годзе палова краін, якія разглядаюцца ў гэтым выданні Індэкса ўстойлівасці АГС, паведамілі пра рост фінансавай устойлівасці. Гэты станоўчы працэс працягваўся і ў 2019 годзе, дзевяць краін паведамілі пра паляпшэнні. Большасць з іх таксама паведамлялі пра паляпшэнні ў папярэднім годзе. Паляпшэнні былі зафіксаваныя ва ўсіх субрэгіёнах, у тым ліку ў трох краінах Паўночнай групы (Літва, Славакія і Славенія), дзвюх краінах Паўднёвай групы (Косава і Паўночная Македонія) і чатырох у Еўразіі (Азербайджан, Малдова, Расія і Украіна). Дзяржаўнае фінансаванне з'яўляецца найважнейшай крыніцай унутранага фінансавання ў многіх краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі, таму павелічэнне ўзроўню дзяржаўнага фінансавання спрыяла паляпшэнню фінансавай устойлівасці ў 2019 годзе ў такіх розных краінах, як Славенія, Азербайджан, Расія і Украіна. У справаздачах Славеніі і Расіі адзначаецца, што дзяржаўнае фінансаванне з'яўляецца найбольш важнай крыніцай фінансавай падтрымкі АГС. У Славеніі дзяржаўнае фінансаванне складае прыблізна 36 % ад агульнага даходу АГС, і ў 2018 годзе,

апошнім годзе, па якім ёсць дадзеныя, дзяржаўнае фінансаванне склала 333 мільёны еўра, што на 6,7 % больш, чым у папярэднім годзе. У Расіі прыкметнае павелічэнне бюджэтнай падтрымкі сацыяльных праектаў АГС на рэгіянальным узроўні спрыяла паляпшэнню фінансавай жыццяздольнасці гэтага сектара. Паводле звестак Міністэрства эканамічнага развіцця, улады васьмідзесяці трох рэгіёнаў выдзелілі больш за 31,3 мільярда рублёў (489 мільёнаў долараў) 4 400 сацыяльна арыентаваным некамерцыйным арганізацыям у 2018 годзе, апошнім годзе, па якім ёсць дадзеныя. Гэта рэзкі рост у параўнанні з 2017 годам, калі гэтыя арганізацыі атрымалі агулам 11,6 мільярдаў рублёў (184 мільёны долараў). Аднак, нягледзячы на шчодрае дзяржаўнае фінансаванне, найбольш актыўныя і вядомыя АГС па правах чалавека і "замежныя агенты" вельмі рэдка атрымліваюць дзяржаўную падтрымку. Ва Украіне ўрад выдзеліў АГС амаль 887 мільёнаў грыўняў (прыблізна 32,7 мільёна долараў) у 2019 годзе, што больш чым удвая перавысіла ўзровень фінансавання 2018 года. Большая частка гэтага фінансавання пайшла на арганізацыі культуры і АГС, якія аказваюць сацыяльныя паслугі. У Азербайджане ў 2019 годзе васямнаццаць дзяржаўных органаў выдзелілі гранты АГС. У 2018 годзе такіх органаў было ўсяго дванаццаць.

Памер фінансавання, якое паступае ў грамадскі сектар праз механізмы, што дазваляюць фізічным асобам адлічаць частку сваіх падаткаў у падтрымку пэўных АГС, таксама павялічыўся ў 2019 годзе. У Славакіі, дзе Закон аб падатку на прыбытак дазваляе кампаніям і індывідуальным падаткаплацельшчыкам прызначаць ад 0,5 да 2 % сваіх падаткаў на падтрымку АГС, памер падатковага фінансавання дасягнуў у 2019 годзе новага максімуму, перавысіўшы 73 мільёны еўра (у 2018 годзе гэта было 68 мільёнаў еўра). У Літве фізічныя асобы могуць аддаць АГС 2 % ад свайго падатка на прыбытак. Там фінансаванне павялічылася з 11,2 мільёна еўра ў 2018 годзе да 13 мільёнаў еўра ў 2019 годзе. Індывідуальныя падаткаплацельшчыкі ў Славеніі могуць прызначаць 0,5 % свайго падатка на падтрымку грамадскіх арганізацый, уключаючы палітычныя партыі, прафсаюзы, рэлігійныя суполкі і няўрадавыя арганізацыі. Сума такой падатковай падтрымкі крыху павялічылася з 4,6 мільёна еўра ў 2017 годзе да 5 мільёнаў еўра ў 2018 годзе, а колькасць асоб, якія пералічаюць долю свайго падатка на падтрымку АГС, павялічылася прыблізна на 1,3 %. Механізм такога тыпу ў Малдове навейшы: 2019 год стаў толькі трэцім годам, калі індывідуальныя падаткаплацельшчыкі маюць права накіроўваць 2 % падатка на падтрымку акрэдытаванай АГС. Фінансаванне, сабранае з дапамогай гэтага механізму, у 2019 годзе дасягнула 7,6 мільёна

леяў (прыблізна 434 000 долараў), павялічыўшыся ў параўнанні з 2018 годам на 37 %. Гэта значна паспрыяла фінансавай устойлівасці малдаўскіх АГС на працягу года. Індывідуальныя падаткаплацельшчыкі Польшчы, Румыніі і Славеніі таксама маюць права накіроўваць долю сваіх падаткаў на падтрымку АГС.

Унутранае фінансаванне зрабіла найбольшы ўнёсак у паляпшэнне фінансавай устойлівасці на ўвесь год. Але замежнае фінансаванне таксама адыграла сваю ролю ў шэрагу краін. У 2019 годзе асаблівую ролю адыграла магчымасць атрымання грантавых сродкаў у рамках Фонду актыўных грамадзян (ACF), праграмы, якая фінансуецца праграмай грантаў Еўрапейскай эканамічнай зоны (ЕЭЗ) і Нарвегіі. Літва, Славакія і Славенія адзначылі запуск ACF як фактар, які паспрыяў паляпшэнню іх фінансавай устойлівасці. У Славакіі ACF выдзеліў 2,65 мільёна еўра на сорак дзевяць праектаў у 2019 годзе. Літва і Славенія атрымаюць першыя гранты ў 2020 годзе. ACF таксама згадваўся ў якасці важнай крыніцы фінансавання АГС у Балгарыі (дзе за 2019 год было выдзелена 6,1 мільёна еўра) і ў Эстоніі (дзе было выдзелена 1,1 мільёна еўра на гэты ж год). Хаця гэтыя гранты не паўплывалі на агульнае паляпшэнне фінансавай устойлівасці. У справаздачах Чэхіі, Венгрыі, Латвіі, Польшчы, Румыніі і Славеніі таксама згадваецца аб запуску альбо чаканым запуску новых магчымасцяў атрымання грантаў у рамках ACF.

Іншыя замежныя крыніцы фінансавання былі названы фактарамі, якія спрыяюць павелічэнню фінансавай устойлівасці ў Косаве і Малдове. Косава звязала павелічэнне фінансавай жыццяздольнасці з пашырэннем грантавых праграм на рэгіянальным узроўні, у тым ліку з боку Рэгіянальнага офіса моладзевага супрацоўніцтва (RYCO), Савета рэгіянальнага супрацоўніцтва (RCC), урада Германіі, а таксама дзякуючы далучэнню АГС Косава да праграмы "Творчая Еўропа". Малдова таксама адзначыла, што павелічэнне замежнага фінансавання, у прыватнасці, з боку ЕС, станоўча паўплывала на фінансавую ўстойлівасць АГС.

Нягледзячы на гэтыя пазітыўныя зрухі для АГС у згаданых краінах да пачатку пандэміі, цяперашняе скарачэнне падатковай базы і прыбыткаў, верагодна, моцна адаб'ецца на індывідуальным, карпаратыўным і дзяржаўным фінансаванні АГС у 2020 годзе.

## ПРАЦЯГ КАМПАНІЙ ПА ДЫСКРЭДЫТАЦЫІ АГС

Нягледзячы на значныя дасягненні АГС у сферах адвакатавання, аказання паслугаў і фінансавай устойлівасці, яны па ўсім рэгіёне заставаліся аб’ектамі нападак з боку дзяржаўных чыноўнікаў, палітыкаў і СМІ. Хоць сітуацыя ў 2018 годзе была горш (тады адзінаццаць краін паведамілі аб кампаніях па дыскрэдытацыі), усё ж у 2019 годзе пяць краін засведчылі пагаршэнне грамадскага іміджу АГС. Кампаніі па дыскрэдытацыі і абразлівыя заявы чыноўнікаў ці палітыкаў былі зазначаныя як важныя фактары, што спрычыніліся да пагаршэння іміджу АГС ва ўсіх пяці краінах. У многіх выпадках гэтыя кампаніі былі звязаныя з надзвычайнай палярызацыяй грамадства і былі накіраваны на АГС, якія займаюцца такімі пытаннямі, як правы чалавека, правы жанчын і добрасумленнае дзяржаўнае кіраванне.

Сітуацыя ў Балгарыі асабліва насцярожвае, паколькі ў краіне зафіксавана істотнае зніжэнне ацэнкі грамадскага іміджу ў 2019 годзе. Нападкі на арганізацыі, якія працуюць па гендарных пытаннях і з групамі ЛГБТІ, былі распаўсюджаны ўжо ў 2018 годзе. У пачатку 2019 года пачаліся нападкі і на арганізацыі, што займаюцца праблемамі дзяцей. Да канца года ўвесь сектар сутыкнуўся з праблемамі. У тым ліку аспрэчвалася роля АГС у грамадстве і заяўлялася аб тым, што арганізацыі фінансуюцца з замежжа і прасоўваюць замежныя інтарэсы.

У Грузіі АГС таксама арганізавана цкаваліся праўладнымі СМІ і прадстаўнікамі кіруючай партыі. Напрыклад, кіруючая партыя абвінаваціла вядомых лідараў АГС у прадузятасці на карысць галоўнай апазіцыйнай партыі. Партыйныя чыноўнікі таксама рэзка крытыкавалі амерыканскія арганізацыі – Нацыянальны дэмакратычны інстытут і Міжнародны рэспубліканскі інстытут – за аналагічную прадузятасць у праведзеных імі апытаннях грамадскай думкі. Між тым ультраправыя групы часта паўтаралі прапагандысцкія наратывы, абвінавачваючы "заходнія АГС" у падрыве традыцыйных грузінскіх каштоўнасцяў. Грамадскі імідж гэтага сектара таксама пагоршыўся ў Сербіі і Польшчы. У абедзвюх краінах урады рэгулярна зневажаюць грамадзянскую супольнасць.

Грамадскія арганізацыі ў Латвіі таксама паведамляюць пра пагаршэнне іміджу ў грамадстве. Дзяржаўныя чыноўнікі і палітыкі дазваляюць сабе прыніжальныя каментары ў адрас АГС і негатыўныя ацэнкі ў СМІ. Аднак такія заявы былі ў Латвіі больш канкрэтнымі, чым у іншых краінах. Там сродкі масавай інфармацыі шырока асвятлялі высновы Дзяржаўнага кантролю аб

тым, што два фонды ўдзельнічалі ў сумнеўных схемах ахвяраванняў, незразумелых здзелках з гандлёвымі маркамі, патэнцыйна фіктыўным найме, беспрынцыпным выдзяленні грантаў і неабгрунтаваным марнаванні сродкаў. Некаторыя выданні рэгулярна сцвярджалі, быццам гэтыя праблемы ўласцівы сектару ў цэлым, і тым самым шкодзілі агульнаму грамадскаму іміджу грамадзянскага сектара.

У той час як толькі пяць краін паведамілі аб зменах у рэйтынгу грамадскага іміджу ў выніку такіх кампаній, шэраг іншых краін таксама паведамілі пра маштабныя медыйныя атакі на сектар у 2019 годзе. АГС у Венгрыі і Румыніі ўжо некалькі гадоў робяцца аб’ектам кампаній па дыскрэдытацыі, і 2019 год не стаў выключэннем. У Венгрыі, нягледзячы на тое, што апошнім часам кампаніі па дыскрэдытацыі з боку асноўных праўладных СМІ і вядучых палітыкаў трохі аслаблі, асобныя арганізацыі, якія займаюцца пэўнымі праблемамі, усё ж працягвалі падвяргацца цкаванню. У Румыніі ў 2019 годзе высокапастаўленыя дзяржаўныя чыноўнікі і палітыкі часта выкарыстоўвалі тэрмін #Rezist з мэтай ачарніць усіх пратэстоўцаў.

У іншых краінах такія нападкі былі адносна новай з'явай. Напрыклад, у Эстоніі ўльтраправая партыя ўрадавай кааліцыі адкрыта крытыкавала АГС, якія працуюць з праблемамі меншасцяў і правамі жанчын, і пагражала скараціць фінансаванне некаторых вядомых арганізацый, якія працуюць у гэтых сферах. У выпадку з Чэхіяй выклікае трывогу тое, што прадстаўнікі "традыцыйных" палітычных партый пачалі выкарыстоўваць рыторыку крытыкі АГС, аналагічную той, якую выкарыстоўваюць радыкальныя палітыкі і партыі. У справаздачах Албаніі, Славакіі, Косава і Малдовы таксама згадваюцца кампаніі па дыскрэдытацыі альбо стыгматызацыі працы АГС у 2019 годзе.

Сітуацыя ў Арменіі дэманструе, якую ролю адыгрывае палітычная палярызацыя ў нападках на АГС. У 2019 годзе армянскае грамадства было моцна палярызаванае паміж людзьмі з ліберальнымі поглядамі, якія ў значнай ступені падтрымліваюць новыя ўлады, і прадстаўнікамі і прыхільнікамі старога рэжыму. На працягу года антырэвалюцыйныя сілы прадстаўлялі АГС як "грантасмокаў" і абвінавачвалі іх у знішчэнні нацыянальных каштоўнасцяў ды прапагандзе замежных парадкаў.

## РЭГІЯНАЛЬНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ ЎСТОЙЛІВАСЦІ АГС

Дваццаць чатыры краіны, якія разглядаюцца ў гэтым *выданні Індэкса ўстойлівасці АГС*, працягваюць значна адрозніваецца з пункту гледжання агульнага ўзроўню ўстойлівасці АГС. Як і ў мінулыя гады, Эстонія мае самы высокі ўзровень сектарнай устойлівасці не толькі ў *Індэксе ўстойлівасці АГС для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі*, але і сярод ўсіх іншых рэгіянальных выданняў Індэкса. АГС у Эстоніі, а таксама большасці іншых краін Балтыі і Вышаградскай групы, працуюць у спрыяльных прававых умовах, маюць моцны арганізацыйны і адвакатыўны патэнцыял і з'яўляюцца эфектыўнымі пастаўшчыкамі паслуг. У той час як фінансавая жыццяздольнасць па-ранейшаму застаецца адным з самых слабых аспектаў устойлівасці, АГС у гэтых краінах маюць доступ да больш разнастайных крыніц фінансавання, уключаючы дзяржаўныя гранты і кантракты, індывідуальную і карпаратыўную дабрачыннасць і падтрымку праз адлічэнні з падаткаў.

На іншым канцы спісу – Беларусь і Азербайджан. АГС у гэтых дзвюх краінах працуюць у вельмі неспрыяльных прававых умовах, якія абмяжоўваюць іх доступ да фінансавання (асабліва замежнага), а таксама амаль выключаюць магчымасці адвакатавання. Яны таксама маюць слабы арганізацыйны патэнцыял і слабую грамадскую падтрымку.

Агульная ўстойлівасць АГС у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і Еўразіі была ў асноўным стабільнай у 2019 годзе, і 15 краін не паведамлялі пра змены ў агульных балах устойлівасці АГС. Пяць краін – Косава, Літва, Паўночная Македонія, Славакія і Украіна – паведамілі пра паляпшэнне агульнай устойлівасці АГС, а чатыры краіны – Беларусь, Балгарыя, Польшча і Сербія – пра пагаршэнне ўзроўню агульнай устойлівасці АГС.

У цэлым, краіны Паўночнай групы (краіны Балтыі і Вышаградскай групы), па-ранейшаму могуць пахваліцца самым высокім агульным узроўнем устойлівасці АГС, у той час як у краінах Еўразіі адзначаецца самы нізкі ўзровень устойлівасці. Што да ўстойлівасці АГС Паўднёвай групы, то яна знаходзіцца дзесьці паміж двума згаданымі вышэй рэгіёнамі. Выключэнні з гэтых субрэгіянальных тэндэнцый складаюць Венгрыя, якая геаграфічна адносіцца да Паўночнай групы, але мае балы параўнальныя з краінамі Паўднёвай групы (Паўднёва-Усходняя Еўропа), і Украіна, якая адносіцца да рэгіёну Еўразія, але ацэньваецца на ўзроўні большасці краін Паўночнай групы.

Далей прадстаўлена кароткае апісанне асноўных тэндэнцый па кожнай з груп краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі.

## Паўночная група




За выключэннем Венгрыі, усе краіны Паўночнай групы па-ранейшаму маюць агульныя балы ўстойлівасці АГС у катэгорыі “Высокая ўстойлівасць”, якая з’яўляецца найвышэйшай. Як ужо было адзначана, Эстонія працягвае паказваць найвышэйшы ўзровень устойлівасці АГС у рэгіёне; паказчык Эстоніі не змяніўся ў 2019 годзе. А Венгрыя працягвае мець самы нізкі ўзровень устойлівасці сярод краін Паўночнай групы. Аднак упершыню за пяць гадоў агульны бал устойлівасці АГС у Венгрыі не знізіўся. Грамадзянская прастора застаецца ў краіне абмежаванай, але ў справаздачы адзначана некалькі станоўчых зрухаў, што адбыліся ў 2019 годзе. Найбольш значная падзея – перамога кандыдатаў ад апазіцыі на мясцовых выбарах, якія прайшлі ў кастрычніку. Апазіцыя перамагла ў Будапешце, многіх найбуйнейшых гарадах краіны і некалькіх меншых населеных пунктах. Па-другое, ціск на грамадзянскую супольнасць (уключна цкаванне, арганізаванае галоўнымі праўладнымі СМІ і вядучымі палітыкамі) за апошнія некалькі гадоў трохі аслаб. Нягледзячы на тое, што нацыянальны ўрад па-ранейшаму варожа ставіўся да адвакатыўных дзеянняў АГС, у 2019 годзе адвакатаванне крыху палепшылася разам з павелічэннем грамадскай актыўнасці, у тым ліку звязанай з мясцовымі выбарамі.

У 2019 годзе ўстойлівасць АГС павысілася ў Літве і Славакіі. Агульны паказчык устойлівасці АГС Літвы палепшыўся другі год запар, што абумоўлена станоўчымі зрухамі ў прававым асяроддзі, фінансавай жыццяздольнасці,

адвакатаванні і сферы аказання паслугаў. Адметнасцю года стала прыняцце новага Закона аб развіцці няўрадавых арганізацый (НДА), які ўдакладняе паняцце НДА і стварае Нацыянальны фонд НДА. Пачынаючы з 2020 года, урад накіруе бюджэтныя сродкі ў Нацыянальны фонд НДА ў памеры роўным 20 і больш адсоткаў ад агульнай долі падаткаў, якую накіравалі некамерцыйным структурам індывідуальныя падаткаплацельшчыкі ў папярэднім годзе. Акрамя таго, АГС адстойвалі свае законныя інтарэсы і выступалі з большай упэўненасцю, быў дасягнуты пэўны прагрэс у перадачы дзяржаўных паслуг сектару АГС, а таксама АГС дыверсіфікавалі крыніцы фінансавання. Славакія аднавіла страчаны ў 2018 годзе ўзровень устойлівасці АГС дзякуючы паляпшэнню прававога асяроддзя, у тым ліку праз прыняцце доўгачаканага Закона аб рэестры няўрадавых некамерцыйных арганізацый, а таксама павышэнню фінансавай жыццяздольнасці.

Славенія таксама адзначыла поспехі ў некалькіх аспектах устойлівасці АГС, хоць іх было недастаткова для павышэння ўзроўню агульнай устойлівасці. Агульны прыбытак сектара павялічыўся, што прывяло да росту фінансавай устойлівасці. Адначасова з гэтым кааліцыі АГС праводзілі шэраг адвакатыўных кампаній, былі створаныя новыя кансультацыйныя органы, а супрацоўніцтва паміж АГС і ўрадам расло на мясцовым узроўні. Устойлівасць АГС у Чэхіі была ў асноўным стабільнай, хаця арганізацыйны патэнцыял трохі палепшыўся, паколькі АГС больш паспяхова працавалі са сваімі мэтавымі групамі.

Устойлівасць АГС у Польшчы пагоршылася ў 2019 годзе чацвёрты год запар. Напярэдадні нацыянальных і еўрапейскіх выбараў нападкі ўрада на АГС, асабліва на тыя, што займаюцца праблемамі ЛГБТІ і судовай сістэмы, узмацніліся. Гэта паўплывала на пагаршэнне прававога асяроддзя. Адвакацыйная дзейнасць аслабла, паколькі якасць грамадзянскага дыялогу і ўзровень удзелу АГС у заканатворчым працэсе знізіліся яшчэ больш, а пастаянныя кампаніі па дыскрэдытацыі АГС яшчэ больш сапсавалі грамадскі імідж сектара. Гэтыя негатыўныя тэндэнцыі былі кампенсаваны некаторымі паляпшэннямі ў сферы аказання паслуг АГС, абумоўленымі ростам колькасці сацыяльных прадпрымальнікаў у краіне.

У Латвіі агульны ўзровень устойлівасці АГС не змяніўся, але краіна адзначыла негатыўныя тэндэнцыі, якія ўплываюць на прававое асяроддзе, інфраструктуру сектара і грамадскі імідж. Павялічылася колькасць прававых норм, якія абмяжоўваюць дзейнасць АГС, праца цэнтраў падтрымкі была запаволена абмежаваным доступам да гнуткага фінансавання, а ўрадавыя чыноўнікі і палітыкі рабілі абразлівыя заявы на адрас АГС.

## Паўднёвая група




Агульныя паказчыкі ўстойлівасці АГС сярод краін Паўднёвай групы працягваюць трапляць у даволі вузкі дыяпазон паказчыкаў у рамках катэгоры "Нестабільная ўстойлівасць" (сярэдні ўзровень устойлівасці). Паколькі Балгарыя паведаміла пра зніжэнне агульнага ўзроўню ўстойлівасці АГС у 2019 годзе, Харватыя цяпер мае самы высокі ўзровень устойлівасці ў гэтым рэгіёне, а суседняя Сербія мае самы нізкі ўзровень агульнай устойлівасці, і яна паведаміла пра далейшае яго падзенне ў 2019 годзе, як апісана ніжэй.

Дзве краіны, Косава і Паўночная Македонія, паведамілі пра паляпшэнне агульных паказчыкаў устойлівасці АГС у 2019 г. Косава паведаміла пра невялікія паляпшэнні ў кожным асобным аспекце ўстойлівасці. Асаблівай увагі заслужыла прыняцце новага закона аб АГС, які прывёў да паляпшэння прававога асяроддзя. Устойлівасць АГС палепшылася ў Паўночнай Македоніі ў 2019 годзе другі год запар, прычым паляпшэнне адзначана ў шасці з сямі параметраў. Найбольш палепшылася адвакатаванне, паколькі АГС паспяхова ўдзельнічалі ў працэсах фармавання палітыкі, і многія іх ініцыятывы былі прыняты ўладамі. Толькі арганізацыйны патэнцыял заставаўся стабільным.

Агульная ўстойлівасць албанскага сектара грамадзянскай супольнасці не змянілася ў 2019 годзе, хаця паляпшэнні былі адзначаны ў некалькіх вымярэннях. АГС прадэманстравалі больш моцны арганізацыйны патэнцыял, бо скарысталіся праграмамі падтрымкі донараў, у той час як стварэнне

Нацыянальнага рэсурснага цэнтра грамадзянскай супольнасці ў Албаніі ўдасканаліла інфраструктуру, якая падтрымлівае гэты сектар. Акрамя таго, палепшылася сфера аказання паслугаў, паколькі АГС прынялі ўдзел у неадкладнай дапамозе супольнасцям, якія пацярпелі ад разбуральнага землятрусу, які адбыўся ў краіне ў лістападзе. Падобна сітуацыі ў Венгрыі з Паўночнай групы, узровень устойлівасць АГС у Румыніі стабілізаваўся ў 2019 годзе пасля некалькіх гадоў падзення, і ў краіне былі адзначаны станоўчыя зрухі ў сферы адвакатавання пасля з’яўлення новага ўрада.

Балгарыя і Сербія, якія пачалі год з адпаведна самым высокім і самым нізкім баламі ў рэгіёне, паведамілі пра зніжэнне ўстойлівасці АГС у 2019 годзе. У Балгарыі нападкі на АГС дасягнулі свайго піку ў 2019 годзе, што прывяло да зніжэння даверу да сектара і пагаршэння грамадскага іміджу сектара. Цкаванне таксама паўплывала на арганізацыйны патэнцыял, бо перашкаджала АГС працаваць са сваімі мэтавымі групамі, прасоўваць свае місіі і займацца адвакатаваннем. Некалькі заканадаўчых прапаноў паставілі пад пагрозу асноўныя прынцыпы свабоды асацыяцый, такія як доступ да фінансавання і права свабоднага аб'яднання суддзяў і пракурораў. Фінансавая ўстойлівасць зніжалася па меры скарачэння наяўных крыніц фінансавання, нягледзячы на тое, што ACF пачаў выдзяляць гранты ў Балгарыі ў 2019 годзе.

Грамадзянская прастора ў Сербіі яшчэ больш скарацілася ў 2019 годзе з узмацненнем абмежаванняў грамадзянскіх свабод і грамадзянскай супольнасці. Чатыры з сямі вымярэнняў – прававое асяроддзе, арганізацыйны патэнцыял, адвакатаванне і грамадскі імідж – пагоршыліся, галоўным чынам, праз неспрыяльнае асяроддзе, у якім вымушаны былі дзейнічаць актывісты грамадзянскай супольнасці. З іншага боку, інфраструктура, якая падтрымлівае сектар АГС, крыху ўзмацнілася з запускам некалькіх новых праграм.

Устойлівасць АГС у Харватыі заставалася стабільнай, былі зафіксаваны як станоўчыя, так і адмоўныя зрухі. Доўгія затрымкі ў праграмах фінансавання прывялі да зніжэння фінансавай жыццяздольнасці і магчымасцяў аказання паслуг. У той жа час грамадскасць мабілізавалася вакол шэрагу грамадзянскіх ініцыятыў, якія тычацца праблемных пытанняў, што прывяло да паляпшэння адвакатавання, а станоўчая грамадская рэакцыя на гэтыя намаганні спрыяла паляпшэнню грамадскага іміджу. Устойлівасць АГС у Босніі і Герцагавіне і Чарнагорыі не змянілася зусім, паколькі ні адна з краін не адзначыла змяненняў балаў ні ў водным параметры ўстойлівасці.

## Еўразія




У сярэднім паказчыкі ўстойлівасці АГС у Еўразіі самыя нізкія ў прадстаўленым рэгіёне, але індывідуальныя паказчыкі ўстойлівасці АГС у субрэгіёне ахопліваюць шырокі дыяпазон, прычым балы ва Украіне набліжаюцца да ўзроўню "Высокая ўстойлівасць", а балы Азербайджана і Беларусі застаюцца ў катэгорыі "Нізкая ўстойлівасць".

Устойлівасць АГС ва Украіне яшчэ больш палепшылася ў 2019 годзе, што было абумоўлена пазітыўнымі зменамі ў прававым полі, арганізацыйным патэнцыяле і ў фінансавай жыццяздольнасці. На іншым баку спектра – Азербайджан, дзе ў 2019 годзе агульная ўстойлівасць АГС не змянілася, хаця адносіны ўрада з АГС у пэўным сэнсе палепшыліся, спрыяючы станоўчым тэндэнцыям у фінансавай жыццяздольнасці і адвакатыўных высілках. АГС мелі больш шырокі доступ да дзяржаўнага фінансавання, а ўрад працягваў рэгістраваць гранты, ахвяраванні і замежныя дамовы аб паслугах. Акрамя таго, некаторыя дзяржаўныя структуры дэманстравалі большую гатоўнасць да супрацоўніцтва з АГС, што дазволіла больш шырокаму колу АГС удзельнічаць у працэсах прыняцця рашэнняў.

АГС у Беларусі таксама працуюць у складаных умовах, і ў цэлым устойлівасць АГС у краіне пагоршылася ў 2019 годзе, перакрэсліўшы дасягненні, зробленыя ў 2018 годзе. Пагаршэнне было выклікана зніжэннем узроўню арганізацыйнага патэнцыялу. Хоць гэтае вымярэнне і застаецца самым моцным аспектам сектара, у апошнія гады развіццё ўнутранага патэнцыялу стала менш прыярытэтным і для АГС, і для донараў: донарскае

фінансаванне на мэты арганізацыйнага развіцця скарацілася, і большасць АГС цяпер не ўкладаюцца ў развіццё патэнцыялу, паколькі ім не хапае ўласных рэсурсаў для інвестыцый у такую дзейнасць.

Агульны ўзровень ўстойлівасці не змяніўся ў Арменіі, Грузіі, Малдове і Расіі, хоць прыкметныя змены былі зафіксаваны ў некаторых вымярэннях ва ўсіх чатырох краінах. У Арменіі былі адзначаны паляпшэнні як у арганізацыйным патэнцыяле, так і ў адвакатаванні. Пры падтрымцы донарскіх праектаў за апошнія некалькі гадоў шэраг АГС развілі свой арганізацыйны патэнцыял, а адвакацыйная дзейнасць АГС палепшылася, паколькі кааліцыі АГС узмацнілі ўплыў на фармаванне дзяржаўнай палітыкі.

Малдаўскія АГС зафіксавалі прагрэс у трох аспектах устойлівасці: фінансавай жыццяздольнасці, аказанні паслугаў і ў інфраструктуры сектара. Фінансаванне замежных донараў павялічылася, у той час як спектр паслугаў АГС дыверсіфікаваўся, а інфраструктура, якая падтрымлівае сектар, палепшылася з ростам патэнцыялу мясцовых донараў.

У справаздачах па Грузіі і Расіі адзначаліся як станоўчыя, так і адмоўныя зрухі. У Грузіі палепшылася адвакацыйная дзейнасць, прадстаўнікі АГС выступалі прыкметнымі лідарамі грамадскай думкі, часта ўплываючы на нацыянальны наратыў і дзелячыся сваім досведам праз розныя медыя каналы. Тым часам грамадскі імідж гэтага сектара пагоршыўся, таму што негатыўная рыторыка ўрада працягвала падрываць давер грамадскасці да АГС. У Расіі палепшыліся арганізацыйны патэнцыял, фінансавая жыццяздольнасць і аказанне паслугаў АГС. Арганізацыйны патэнцыял АГС нязначна палепшыўся за кошт больш шырокага выкарыстання імі лічбавых тэхналогій і павелічэння ўдзелу грамадзян у дабрачынных і сацыяльных валанцёрскіх кампаніях, арганізаваных АГС. Паляпшэнню фінансавай устойлівасці гэтага сектара паспрыяў рост рэгіянальнага дзяржаўнага фінансавання АГС і дабрачыннасці. Аказанне паслугаў палепшылася як дзякуючы некаторым нязначным зменам у 2019 годзе, так і паступовым зменам за апошнія некалькі гадоў, якія былі недастатковымі, каб апраўдаць змену балаў з аднаго года на наступны, але прывялі да сукупнага паляпшэння ў сферы аказання паслугаў. Аднак гэтыя паляпшэнні нівеліраваліся ўмераным пагаршэннем прававога асяроддзя для груп актывістаў, незалежных арганізацый, якія абараняюць правы грамадзян, а таксама незалежных журналістаў і сродкаў масавай інфармацыі, у выніку чаго агульная ўстойлівасць АГС засталася нязменнай.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Справаздачы па асобных краінах змяшчаюць глыбокі аналіз стану сектараў АГС у дваццаці чатырох краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі ў 2019 годзе. Хоць справаздачы за 2020 год, верагодна, будуць апісваць зусім іншую сітуацыю, мы спадзяемся, што гэтае штогадовае даследаванне працягне фіксаваць карысныя тэндэнцыі для АГС, урадаў, донараў і даследчыкаў.

# УСТОЙЛІВАСЦЬ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ БЕЛАРУСІ - 2019

## УСТОЙЛІВАСЦЬ АГС: 5.5 (2018: 5.4)




У 2019 годзе АГС Беларусі працягнулі працаваць у складаных умовах. На парламенцкіх выбарах, што адбыліся ў лістападзе, кандыдаты ад апазіцыі і прадстаўнікі дэмакратычных АГС не атрымалі ніводнага месца ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Улады працягвалі пераследваць актывістаў АГС, журналістаў, блогераў і прадстаўнікоў апазіцыі, выкарыстоўваючы прэвентыўныя затрыманні і прысуджаючы іх да штрафаў і адміністрацыйных арыштаў, асабліва ў перыяд парламенцкіх выбараў і падчас снежаньскіх пратэстаў супраць паглыблення інтэграцыі Беларусі і Расіі.

У 2019 годзе ўзровень устойлівасці сектара АГС некалькі знізіўся з-за пагаршэння ацэнкі па арганізацыйным патэнцыяле. Хоць гэты параметр застаецца наймацнейшым сярод сямі паказчыкаў устойлівасці сектара, у апошнія гады развіццё ўнутранага патэнцыялу стала для АГС менш прыярытэтным.

Арганізацыі грамадзянскай супольнасці працягваюць працаваць у неспрыяльных прававых умовах, у значнай ступені залежаць ад замежнага фінансавання і маюць вельмі абмежаваныя магчымасці ўплыву на працэс прыняцця рашэнняў у краіне. Акрамя таго, АГС выказвалі занепакоенасць пагрозай расійскай інтэрнэт- і тэлевізійнай прапаганды, якая працягвае расці. Тым не менш, многія арганізацыі на працягу года прыкладалі намаганні да павышэння празрыстасці сваёй дзейнасці, а ўлады дэманстравалі некаторую адкрытасць да патрабаванняў актыўных грамадскіх груп.

Па стане на 1 студзеня 2020 года ў Беларусі было зарэгістравана 2995 грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку 227 міжнародных, 785 рэспубліканскіх і 1983 мясцовых, а таксама 43 545 арганізацыйных структур грамадскіх аб'яднанняў. Зарэгістравана таксама 25 прафесійных саюзаў, 40 саюзаў (асацыяцый) грамадскіх аб'яднанняў, 217 фондаў і 7 рэспубліканскіх дзяржаўных грамадскіх аб'яднанняў. У 2019 годзе было зарэгістравана 98 новых грамадскіх аб'яднанняў, адна новая асацыяцыя грамадскіх аб'яднанняў і 22 новыя фонды. Усё больш АГС рэгіструюцца ў форме некамерцыйных установ, паколькі працэс іх стварэння больш просты, аднак дадзеныя аб колькасці такіх арганізацый адсутнічаюць.

## ПРАВАВЫ АСЯРОДАК: 6.6 (2018: 6.6)

ПРАВАВЫ АСЯРОДАК У БЕЛАРУСІ




Прававое асяроддзе для дзейнасці беларускіх АГС у 2019 годзе не зведала істотных змен і працягвала значна абмяжоўваць іх працу.

Паводле апытання CSO Meter, праведзенага ў 2019 годзе Асамблеяй няўрадавых дэмакратычных арганізацый і Цэнтрам прававой трансфармацыі Lawtrend, большасць апытаных арганізацый (79%) лічаць, што АГС ва ўмовах Беларусі працаваць складана, а 73% арганізацый сутыкаліся ў сваёй дзейнасці з перашкодамі з боку ўлады.

У 2019 годзе быў вынесены на абмеркаванне шэраг законапраектаў, у якіх зацікаўленыя АГС, але толькі некаторыя з іх былі прынятыя і ўступілі ў сілу. У ліпені 2019 года пачала дзейнічаць прынятая парламентам у снежні 2018 года адмена артыкула 193.1 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, якая прадугледжвала пазбаўленне волі за дзейнасць незарэгістраваных АГС. Аднак сама забарона на дзейнасць АГС без рэгістрацыі засталася, і цяпер за гэта прадугледжваецца штраф па артыкуле 23.88 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. І хоць накладанне такіх штрафаў па законе магчыма без судовага разгляду справы, у 2019 годзе такіх выпадкаў зафіксавана не было.

Вельмі неспрыяльны для АГС праект змен быў прапанаваны ў 2019 годзе ў Закон «Аб грамадскіх аб'яднаннях». У ім з'явіліся новыя абмежаванні: поўная забарона на размяшчэнне юрыдычных адрасоў у прыватных дамах,

абавязак публікацыі фінансавых справаздач, абавязак для аб'яднанняў рэспубліканскага ўзроўню мець аддзяленні ў большасці абласцей Беларусі. Пры гэтым папраўкі прадугледжваюць і шэраг пазітыўных змен, у тым ліку пашырэнне магчымасцей для камунікацыі АГС з дзяржаўнымі органамі ў рэжыме анлайн і скарачэнне мінімальнай колькасці заснавальнікаў рэспубліканскага грамадскага аб'яднання з пяцідзесяці да сарака. Улады арганізавалі грамадскае абмеркаванне гэтага праекта змен, у Міністэрстве юстыцыі была створана рабочая група па распрацоўцы праекта закона з удзелам шырокага спектра АГС, хоць у склад гэтай групы былі ўключаныя не ўсе АГС, якія выказалі жаданне ў ёй працаваць. Аднак законапраект, унесены ў парламент у снежні, захаваў усе тыя нормы, якія крытыкавалі прадстаўнікі сектара.

Праект закона захоўвае існуючы парадак рэгістрацыі грамадскіх аб'яднанняў, які дае дзяржаве права адмовіць у рэгістрацыі АГС на малазначных падставах і па тэхнічных прэтэнзіях, чым дзяржава карыстаецца для прадухілення рэгістрацыі непажаданых аб'яднанняў. У 2019 годзе было адмоўлена ў рэгістрацыі грамадскім аб'яднанням «ЭкаБрэст» і «Несмяротны полк». У красавіку Вярхоўны суд пакінуў у сіле адмову Міністэрства юстыцыі ў рэгістрацыі праваабаронча-асветніцкага аб'яднання «Дзея», нягледзячы на тое, што па выніках працэса дзве з трох падстаў для адмовы ў рэгістрацыі былі прызнаныя судом беспадстаўнымі. Дадзеная сітуацыя паказвае, што судовае абскарджанне з'яўляецца неэфектыўным спосабам абароны правоў АГС.

Установы, што ствараюцца адным уласнікам, працягваюць заставацца найбольш распаўсюджанай формай рэгістрацыі новых АГС, аднак і для іх існуюць беспадстаўныя абмежаванні. Напрыклад, працэс узгаднення назвы ўстановы часцяком выкарыстоўваецца дзяржавай для чынення перашкодаў у рэгістрацыі непажаданых арганізацый.

Згодна з існуючым заканадаўствам, для атрымання АГС кожнага замежнага ахвяравання патрабуецца дазвол дзяржавы, асобны дазвол трэба і для вызвалення замежнай дапамогі ад падаткаў. Таксама захоўваецца прынцып абмежаванага пераліку мэтаў, на якія можа быць атрымана замежная і ўнутраная спонсарская дапамога: сярод гэтых дазволеных мэт няма праваабарончай дзейнасці, гендэрнай роўнасці і многіх іншых мэт АГС. За парушэнне гэтага складанага парадку атрымання як унутранай, так і знешняй дапамогі ўстаноўлена адказнасць, у тым ліку ў дачыненні да замежнай дапамогі прадугледжана пазбаўленне волі тэрмінам да двух гадоў.

АГС не заўсёды даводзяць да грамадскасці інфармацыю пра выпадкі адмовы ў рэгістрацыі замежных грантаў, баючыся стварэння негатыўнага іміджу ў вачах дзяржавы і магчымых адмоў у рэгістрацыі будучых праектаў. На працягу года, аднак, як найменш дзве АГС абвясцілі аб тым, што ўжо атрыманыя ад замежных донараў сродкі будуць вернутыя ў сувязі з адмовай у рэгістрацыі праектаў у Дэпартаменце па гуманітарнай дзейнасці. Сярод іх праект Цэнтра па прасоўванні правоў жанчын «Яе правы», што атрымаў фінансаванне ад Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці і нацэлены на ўзмацненне патэнцыялу жанчын і дзяўчынак праз выкараненне дыскрымінацыі па прыкмеце полу.

Праекты актаў прэзідэнта, якія рэгулююць атрыманне замежнай бязвыплатнай дапамогі і ўнутранай спонсарскай дапамогі з бізнес-крыніц, у 2019 годзе знаходзіліся на абмеркаванні ва ўрадзе. Да канца года іх актуальная версія заставалася недаступнай для грамадскасці, аднак было вядома, што заканадаўца не плануе адмаўляцца ад існуючага парадку рэгістрацыі замежнай дапамогі.

АГС пакутуюць ад абмежаванняў, якія тычацца свабоднага правядзення мірных сходаў, пашырэння меркаванняў, доступу да інфармацыі аб дзейнасці дзяржаўных органаў, а таксама ў некаторых выпадках ад адвольных затрыманняў,ператрусаў у офісах і іншых форм ціску. Новая рэдакцыя Закона Рэспублікі Беларусь «Аб масавых мерапрыемствах», прынятая ў ліпені 2018 года, уступіла ў сілу 26 студзеня 2019 года. Яна дазваляе праводзіць масавыя мерапрыемствы па паведамляльным прынцыпе без атрымання ад уладаў папярэдняга дазволу, у выпадках калі мерапрыемствы праводзяцца ў месцах, вызначаных для гэтага мясцовымі выканкамамі. Такія месцы, праўда, часта знаходзяцца далёка ад цэнтра і з'яўляюцца цяжкадаступнымі. Вызначанае законам новае азначэнне паняцця «масавае мерапрыемства» празмерна шырокае, і да яго цяпер аднесены і культурна-відовішчныя мерапрыемствы, што патрабуе ад АГС атрымліваць дазвол на правядзенне турыстычных злётаў, летніх лагераў і г. д. Больш за тое, на пачатку 2019 года ўрад прыняў пастанову, якая вызначае вялікія стаўкі абавязковай аплаты паслуг па ахове правапарадку падчас акцый. У выніку колькасць праведзеных АГС сходаў, мітынгаў і дэманстрацый у 2019 годзе істотна зменшылася. Улады забаранілі партыі БНФ і ўстанове «Амарока» правядзенне на стадыёне «Дынама» 24 сакавіка святкавання Дня волі. Арганізатары традыцыйнага Чарнобыльскага шляху адмовіліся ад штогадовага шэсця ў сувязі з падвышанымі стаўкамі аплаты за паслугі міліцыі. На працягу года ўлады неаднаразова забаранялі акцыі ініцыятывы «Маршыруй, дзетка!», якая выступае супраць гвалту ў сям'і,

у тым ліку акцыі, запланаваныя ў спецыяльных месцах, у дачыненні да якіх дзейнічае паведамляльны парадак правядзення.

Па дадзеных Праваабарончага цэнтра «Вясна», цягам 2019 года быў зафіксаваны 571 выпадак прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці на палітычных падставах, а таксама ў сувязі з рэалізацыяй грамадзянскіх і палітычных правоў. Так, напрыклад, былі прыцягнуты да адказнасці ў форме вялікіх адміністрацыйных штрафаў і арыштаў удзельнікі акцый пратэсту супраць паглыблення інтэграцыі Беларусі і Расіі.

Затрыманні і дагляды актывістаў АГС застаюцца распаўсюджанай практыкай, асабліва пры перасячэнні імі мяжы Беларусі, што суправаджаецца адабраннем носьбітаў інфармацыі, у тым ліку на падставе «праверкі на прадмет наяўнасці экстрэмісцкіх матэрыялаў». У траўні адбыліся абуральныя выпадкі ціску на мясцовыя арганізацыі сінці і ромаў, абумоўленыя этнічным прафіляваннем з боку міліцыі ў сувязі з забойствам у Магілёве супрацоўніка ДАІ, нібыта здзейсненым трыма мужчынамі ромскай нацыянальнасці. У выніку больш за 100 ромаў былі затрыманыя. Была пакараная арыштам і кіраўнічка АГС «Рамана Дром» Вольга Нячаева, у ейным доме адбыўся перагрус.

Грамадскім аб'яднанням забаронена займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, але АГС маюць права ўдзельнічаць у конкурсах на атрыманне дзяржаўнага сацыяльнага заказу, што абвяшчаюцца мясцовымі ўладамі.

У сувязі с недахопам прапаноў юрыдычных паслуг для АГС, асабліва ў рэгіёнах, і іх высокім коштам многія АГС маюць абмежаваны доступ да кваліфікаванай прававой дапамогі. Спецыялізаваную прававую дапамогу АГС аказваюць Асамблея НДА і Цэнтр прававой трансфармацыі Lawtrend, аднак агульнае змяненне донарскіх падыходаў змушае гэтыя арганізацыі з прычыны недастатковасці рэсурсаў скарачаць аб'ём бясплатных прававых кансультацый.

## АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ: 4.8 (2018: 4.7)

У 2019 годзе арганізацыйны патэнцыял сектара нязначна аслабеў. Нягледзячы на тое, што ключавыя грамадскія арганізацыі і ініцыятывы захавалі ўзровень свайго патэнцыялу, а ў буйных гарадах і іншых частках краіны былі створаны новыя АГС, развіццё ўнутранага патэнцыялу арганізацый страціла сваю прыярытэтнасць як для саміх АГС, так і для донараў. Паколькі донарскае фінансаванне арганізацыйнага развіцця скарачаецца, АГС

даводзіцца інвеставаць уласныя рэсурсы ў нарошчванне патэнцыялу. Паколькі такіх рэсурсаў арганізацыям бракуе, многія з іх наогул не займаюцца сваім інстытуцыянальным развіццём.

**АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ У БЕЛАРУСІ**




Вядучыя АГС выразна вызначаюць мэтавую аўдыторыю, на якую скіравана дапамога, і патэнцыйных прыхільнікаў і па магчымасці ўцягваюць іх у сваю дзейнасць. Сярод такіх АГС галоўным чынам экалагічныя і членскія арганізацыі, такія як Задзіночанне беларускіх студэнтаў, Ахова птушак Бацькаўшчыны і Мінскае веласіпеднае таварыства. Нефармальныя ініцыятывы і грамадскія рухі будуюць сваю дзейнасць, абапіраючыся на падтрымку прыхільнікаў. Аднак у 2019 годзе адны арганізацыі прыкладалі сур'ёзныя намаганні да збору рэсурсаў, неабходных для прыцягнення прыхільнікаў, у той час як іншыя АГС з-за недахопу рэсурсаў скарацілі або зусім спынілі сваю працу з прыхільнікамі.

Большасць арганізацый прытрымліваюцца сваіх заяўленых місій, але часта гатовыя памяняць прыярытэты сваёй дзейнасці, што абумоўлена іх залежнасцю ад донараў і абмежаваным доступам да фінансавання. Больш буйныя і дасведчаныя грамадскія арганізацыі праводзяць стратэгічнае планаванне, але працягваюць выкарыстоўваць састарэлыя падыходы і інструменты. Нефармальныя ініцыятыўныя групы не бачаць вялікага сэнсу ў стратэгічным планаванні. Большасць АГС не выкарыстоўваюць інструменты ацэнкі рэалізацыі стратэгіі, тым не менш яны імкнуцца ацэньваць эфектыўнасць асобных мерапрыемстваў. Шэраг АГС, напрыклад, Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый, сістэматычна замерваюць рэзультатыўнасць сваёй дзейнасці.

Усе зарэгістраваныя АГС, акрамя некамерцыйных устаноў, па законе абавязаныя мець кіруючыя органы (рады, праўленні), а іх ролі і абавязкі павінны быць прапісаны ў статутах. Аднак у многіх арганізацыях адсутнічае выразны падзел роляў і абавязкаў паміж кіруючымі органамі і выканаўчымі структурамі. У выніку ва многіх АГС менеджэры з'яўляюцца членамі праўленняў і рад. Буйныя АГС распрацоўваюць палітыкі і працэдуры ўнутранага кіравання. Так, у 2019 годзе Грамадская арганізацыя «Хрысціянская садружнасць дарослых і маладых» (YMCA Belarus) прыняла

палітыку па гендэрных пытаннях і інклюзіі, а Асацыяцыя дадатковай адукацыі і асветы распрацавала членскую палітыку. Аднак многія АГС не маюць такіх палітык, паколькі іх стварэнне патрабуе часу, прафесійных навыкаў і адказнага стаўлення да іх распрацоўкі і ўкаранення.

Многія АГС няздольныя ўтрымліваць пастаянных супрацоўнікаў або наймаць новых, таму што ім не хапае на гэта рэсурсаў. Большасць супрацоўнікаў працуюць у арганізацыях на праектнай аснове. Шэраг донарскіх арганізацый зніжаюць у бюджэтах праектаў долю, якую можна выкарыстоўваць на заработную плату супрацоўнікаў, у сувязі з чым праектныя каманды вымушаныя працаваць больш за меншую плату. Гэта адбівае ахвоту працаваць і стварае дадатковыя цяжкасці з прыцягненнем работнікаў у АГС. Працэдуры кіравання персаналам АГС, у тым ліку службовыя інструкцыі, чарговыя і дэкрэтныя адпачынкі, застаюцца недасканалымі. Персаналу АГС неабходна развіваць навыкі ў кіраванні праектамі, маніторынгу і ацэнцы, каманднай працы і адвакатаванні, але арганізацыі рэдка могуць дазволіць сабе аплату ўдзелу сваіх супрацоўнікаў у навучанні ў краіне ці за мяжой. Навучанне лідэрскім навыкам вельмі абмежавана. Некаторыя кіраўнікі АГС займаюць свае пасады дзесяцігоддзямі. Кіраўнікі моладзевых арганізацый рэгулярна змяняюцца, але гэта часта адбываецца настолькі хутка, што новым людзям у АГС не хапае часу навучыцца ў сваіх папярэднікаў.

АГС разумеюць важнасць прыцягнення і развіцця валанцёраў. Валанцёрства з'яўляецца неад'емнай часткай дзейнасці такіх АГС, як SOS-Дзіцячыя вёскі і Праваабарончы цэнтр «Вясна». Арганізацыя Human Constanta праводзіць штомесячныя сустрэчы для сваіх валанцёраў, каб развіваць іх кампетэнцыі і падтрымліваць уцягнутасць. Улетку 2019 года Беларускі нацыянальны моладзевы савет РАДА правёў у Мінску штогадовы валанцёрскі фестываль з удзелам больш за 100 валанцёраў. Паводле Сусветнага індэкса дабрачыннасці, апублікаванага ў 2019 годзе, за апошнія дзесяць гадоў 25% рэспандэнтаў з Беларусі ўдзельнічалі ў добраахвотніцкай дзейнасці.

Многія АГС перадаюць прафесійныя паслугі бухгалтараў, IT-менеджэраў і юрыстаў на аўтсорсінг, паколькі самі не могуць дазволіць сабе наняць такіх супрацоўнікаў. Кваліфікаваных бухгалтараў, якія разумеюць спецыфіку працы АГС, у сектары па-ранейшаму мала, таму дасведчаным спецыялістам часта даводзіцца працаваць у некалькіх арганізацыях адначасова.

АГС актыўна карыстаюцца сацыяльнымі сеткамі і інтэрнэт-рэсурсамі. Супрацоўнікі і валанцёры нярэдка працуюць на асабістых кампутарах і іншым абсталяванні, паколькі ў межах многіх грантавых конкурсаў арганізацыі не

могуць купляць або мадэрнізаваць абсталяванне за кошт сродкаў праекта. АГС працягваюць выкарыстанне сучасных інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій (ІКТ), у тым ліку Facebook, Signal, Slack і Telegram. «Вконтакте» і «Одноклассники» застаюцца самымі папулярнымі сацыяльнымі сеткамі ў Беларусі. Моладзевыя АГС і невялікія мясцовыя супольнасці шырока выкарыстоўваюць «Вконтакте», а ў "Одноклассниках" прысутнічаюць толькі лічаныя АГС. Некаторыя арганізацыі ў якасці канала для прыцягнення падлеткаў і маладых людзей пачалі выкарыстоўваць TikTok. ІКТ унеслі пазітыўныя змены ў дзейнасць АГС, аднак многія АГС не валодаюць тэхнічнымі кампетэнцыямі, неабходнымі для паўнавартаснага выкарыстання ўсіх магчымасцей гэтых тэхналогій.

## ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ: 6.3 (2018: 6.3)

ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ У БЕЛАРУСІ




Фінансавая ўстойлівасць беларускіх АГС у 2019 годзе не змянілася, але застаецца слабай. АГС па-ранейшаму моцна залежаць ад замежнага фінансавання, падтрымка ад мясцовых донараў практычна адсутнічае, і толькі нешматлікія арганізацыі могуць весці дзейнасць, якая прыносіць даходы.

Прававыя рамкі абмяжоўваюць магчымасці АГС атрымліваць як замежнае, так і мясцовае фінансаванне. АГС абавязаны рэгістраваць усе гранты і ахвяраванні з-за мяжы, а таксама прэзідэнцкія дэкрэты і ўказы вызначаюць пералік мэт, на якія АГС дазволена атрымліваць замежную бязвыплатную і карпаратыўную спонсарскую дапамогу. Грамадзкім аб'яднанням забаронена весці прадпрымальніцкую дзейнасць.

Дакладныя дадзеныя аб аб'ёме міжнароднай донарскай дапамогі беларускай грамадзянскай супольнасці за 2019 год недаступныя, аднак, па адчуваннях АГС, аб'ём гэтай дапамогі скараціўся. Больш за тое, донары ўсё часцей накіроўвалі сродкі на падтрымку мясцовых органаў улады і створаных урадам НДА, а таксама патрабавалі ад АГС афіцыйнай рэгістрацыі праектаў і забеспячэння сумеснага фінансавання, што ўскладніла доступ АГС да грантавых сродкаў.

Усё больш арганізацый выкарыстоўвалі свае вэб-сайты для збору ахвяраванняў ад прыватных асоб. Шэраг АГС пачалі збіраць рэгулярныя ахвяраванні праз сістэму падпіскі. У 2018 годзе Моладзевае грамадскае аб'яднанне «Фаланстэр» распрацавала праграму Doika, якую АГС могуць усталяваць на сваіх сайтах для збору ахвяраванняў і членскіх узносаў без пасярэднікаў або камісійных збораў. У 2019 годзе гэтым інструментам карысталіся пятнаццаць АГС.

АГС больш актыўна выкарыстоўвалі краўдфандынгавыя механізмы для прыцягнення грамадзян і атрымання фінансавай падтрымкі, але ў цэлым гэтая практыка застаецца рэдкай. На працягу 2019 года на найбуйнейшай краўдфандынгавай платформе Ulej.by было запушчана 218 новых праектаў, і 98 з іх паспяхова сабралі мэтавую суму грошай агульным памерам 250 000 долараў ЗША. У 2019 годзе Ulej запусціў платформу MolaMola – новы краўдфандынгавы сэрвіс для фізічных асоб. У канцы 2019–пачатку 2020 года кампанія BY_Help сабрала праз MolaMola больш за 12 000 долараў ЗША на аказанне дапамогі беларусам, у дачыненні да якіх былі ўжытыя рэпрэсіі пасля снежаньскіх пратэстаў. Гэтыя грошы галоўным чынам выкарыстоўваліся для аплаты адміністрацыйных штрафаў. У траўні MolaMola, аднак, заблакавала кампанію па зборы сродкаў на аплату штрафаў блогера Сяргея Пятрухіна па крымінальным артыкуле, патлумачыўшы, што такая дапамога можа быць расцэненая як спроба ўхілення вінаватай асобай ад прызначанага пакарання. Большую частку 2019 года не працаваў збор ахвяраванняў на найстарэйшай беларускай краўдфандынгавай платформе Talaka.by.

Дзяржаўная фінансавая падтрымка АГС галоўным чынам зводзіцца да прамога і непразрыстага фінансаванню арганізацый, якія кантралююцца дзяржавай. Акрамя таго, мясцовыя ўлады субсідуюць сацыяльныя паслугі АГС праз механізм дзяржаўнага сацыяльнага заказа. У 2019 годзе на дзяржаўны сацыяльны заказ паслуг АГС у сферы сацыяльнага абслугоўвання і прафілактыкі ВІЧ з дзяржаўнага бюджэту было выдзелена каля 440 000 долараў ЗША, былі складзены 123 дагаворы. Хоць колькасць кантрактаў і фінансавай падтрымкі з дзяржбюджэту ў параўнанні з мінулым годам павялічылася, для большасці беларускіх АГС такое фінансаванне застаецца недаступным.

Шэраг АГС, якія маюць наладжаныя ўзаемаадносіны з уладамі, могуць атрымліваць нефінансавую падтрымку дзяржавы, галоўным чынам у выглядзе бясплатных памяшканняў, што адводзяцца мясцовымі ўладамі. Некаторыя АГС атрымліваюць даходы ад аказання платных паслуг, у тым ліку ад продажу

квіткоў на мерапрыемствы, здачы ў арэнду сваіх памяшканняў і складання кантрактаў. Аднак атрыманне АГС даходаў ад продажу тавараў і паслуг папранейшаму з'яўляецца рэдкай практыкай, а сабраных сродкаў для забеспячэння ўстойлівасці арганізацыі не хапае. Напрыклад, Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый у 2019 годзе збіраў ахвяраванні праз свой вэб-сайт і правёў мерапрыемства з платным уваходам, але атрыманыя такім чынам сродкі, паводле ацэнак арганізацыі, пакрылі менш за 5% агульных аперацыйных выдаткаў.

У 2019 годзе, галоўным чынам дзякуючы пастаянным намаганням ОДБ Брусель, актыўна прасоўвалася канцэпцыя сацыяльнага прадпрымальніцтва. Арганізацыя выпусціла саракахвілінны фільм пра развіццё сацыяльнага прадпрымальніцтва ў Беларусі, выдала дапаможнік, які ўтрымлівае агляд перадавога вопыту АГС краіны ў гэтай сферы, і сумесна з фондам «Добра» арганізавала форум сацыяльнага бізнесу. Прыкладамі новых сацыяльных прадпрыемстваў, створаных у 2019 годзе, з'яўляюцца інклюзіўная кавярня «Больш чым кава» і пякарня «Добрае печыва», у якой працуюць і навучаюцца людзі з псіхічнымі разладамі.

Буйныя членскія арганізацыі збіраюць членскія ўзносы, але, як правіла, іх памер мінімальны, хоць часам яны дазваляюць АГС пакрываць некаторыя асноўныя выдаткі, напрыклад, арэнду офіса.

Некалькі ініцыятыў працягваюць прасоўваць культуру карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці і карпаратыўнай філантропіі ў Беларусі. Сацыяльны фонд «Добра» распрацаваў Індэкс Дабра, які ацэньвае сацыяльную адказнасць беларускіх бізнес-кампаній. У 2019 года ў межах конкурса Social Weekend бізнес інвеставаў у сацыяльныя і грамадска карысныя праекты больш за 70 000 долараў ЗША.

У сувязі з вымушанай адсутнасцю фінансавай празрыстасці і падсправаздачнасці большасці беларускіх АГС надзейнасць сістэм іх фінансавага кіравання застаецца ў значнай ступені нявывучанай. Фінансавыя справаздачы публікуюць толькі лічаныя арганізацыі і грамадскія кампаніі, якія актыўна выкарыстоўваюць краўдфандынг. Напрыклад, платформа Petitions.by штоквартальна публікуе справаздачы аб выкарыстанні сабраных ахвяраванняў. У той жа час, большасць АГС падаюць поўныя фінансавыя планы і справаздачы толькі сваім донарам.

## АДВАКАТАВАННЕ: 5.1 (2018: 5.1)




У 2019 года ў адвакатаванні былі адзначаны як поспехі, так і няўдачы, што ў выніку пакінула адзнаку па гэтым параметры без зменаў.

Рух «Маці 328» у 2019 годзе праводзіў паспяховую працу супраць несправядлівых прысудаў, вынесеных у адпаведнасці з антынаркатычным заканадаўствам. Прадстаўнікі руху сустракаліся з міністрам унутраных спраў і кіраўніком адміністрацыі прэзідэнта, і ў выніку парламент унёс папраўкі ў артыкул 328 Крымінальнага кодэкса, якія змякчаюць пакаранне за незаконны абарот наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка публічна паабяцаў персанальныя памілаванні тым, хто ўжо асуджаны. У Брэсце грамадзяне паспяхова пратэставалі, патрабуючы закрыцця акумулятарнага завода «АйПаўэр» з-за шкоды, які ён наносіць навакольнаму асяроддзю і здароўю людзей. Згодна з гадавым аглядам «Беларусь у фокусе», у выніку супрацоўніцтва ўрада і экспертаў недзяржаўнага эканамічнага форума KEF склаўся кансэнсус аб неабходнасці рынкавых рэформ у Беларусі, які падтрымліваецца большасцю насельніцтва краіны.

Ініцыятыва «Маршыруй, дзетка!» працягвала адвакатыўную кампанію за прыняцце закона «Аб супрацьдзеянні хатняму гвалту», арганізуючы публічныя акцыі і выступаючы на міжнародных пляцоўках. Кампанія прыцягнула значную ўвагу сродкаў масавай інфармацыі. У выніку ў 2019 годзе «Маршыруй, дзетка!» дамаглася афіцыйных сустрэч з міністрам замежных спраў і намеснікам міністра ўнутраных спраў Беларусі, а таксама атрымала падтрымку прыняцця такога закону з боку аднаго з новых дэпутатаў парламента. Яшчэ адна грамадзянская ініцыятыва «Моладзевы блок», заснаваная актывістамі АГС восенню 2019 года, ярка адвакатавала на парламенцкіх выбарах тэмы адукацыі, альтэрнатыўнай службы ў войску і змякчэння антынаркатычнага заканадаўства. Аднак, нягледзячы на ўсю гэтую актыўнасць, ні «Маршыруй, дзетка!», ні «Моладзевы блок» пакуль не дасягнулі канкрэтных вынікаў.

У снежні 2019 года некалькі тысяч чалавек прынялі ўдзел у дэманстрацыях у Мінску, пратэстуючы супраць так званай «паглыбленай інтэграцыі» з Расіяй. Пратэсты былі арганізаваныя апазіцыйнымі палітыкамі і кампаніяй «Свежы вецер» у адказ на сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна, на якіх абмяркоўваліся пытанні інтэграцыі і энергарэсурсаў. Два прэзідэнты не змаглі дасягнуць пагаднення ні па адным з гэтых пытанняў, і ў наступныя месяцы вулічныя пратэсты спыніліся. Падчас снежаньскіх пратэстаў улады ўдзельнікаў акцыяў не разганялі, але ў пачатку 2020 года больш за 100 чалавек былі пакараныя штрафамі і адміністрацыйнымі арыштамі.

У Беларусі па-ранейшаму няма эфектыўных механізмаў лабіравання і адвакатавання. У 2019 годзе ўступіў у сілу Закон Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах». Закон устанавіў мінімальныя тэрміны для грамадскіх абмеркаванняў, абавязаў дзяржаўныя органы публікаваць іх вынікі і ўрэгуляваў механізмы правядзення абмеркаванняў у інтэрнэце. Аднак на практыцы гэта не дадало АГС магчымасцей уплываць на працэсы прыняцця рашэнняў. Міністэрствы працягнулі праводзіць грамадскія абмеркаванні на сваіх вэб-сайтах, хоць у большасці выпадкаў вынікі гэтых абмеркаванняў не аказваюць істотнага ўплыву на рашэнне важных пытанняў. Час ад часу ўлады запрашаюць асобных экспертаў з АГС да ўдзелу ў нарадах і рабочых групах. Так, напрыклад, прадстаўнікі кааліцыі «За годнае даўгалецце» і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны сумесна працуюць над Нацыянальнай стратэгіяй актыўнага даўгалецця. Аднак гэта выбіральная практыка.

Грамадскія рады з удзелам арганізацый грамадзянскай супольнасці ёсць практычна пры кожным дзяржаўным органе, аднак яны не маюць адзінага стандарта і прынцыпаў рэгулявання, крытэрыі адбору АГС невыразныя і часцей за ўсё неаб'ектыўныя, а працэдура адбору непразрыстая. Мандаты грамадскіх рад зазвычай вельмі абмежаваныя, і вынікі абмеркаванняў могуць не ўплываць на будучыя рашэнні. Паводле дадзеных анлайн-апытання CSO Meter 2019, 30% апытаных АГС удзельнічаюць у працы кансультацыйных органаў і грамадскіх рад пры дзяржорганах, аднак астатнія 70% у большасці сваёй і не прыкладалі намаганняў, каб туды патрапіць.

На парламенцкіх выбарах 2019 года некаторыя грамадскія актывісты нават не былі зарэгістраваны кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Іншым было дазволена балатавацца, але яны не былі абраныя.

У 2019 годзе Каардынацыйны савет грамадскіх прасямейных сіл Беларусі, ультракансерватыўная кааліцыя сямі АГС і рэлігійных арганізацый,

актыўна агітаваў, у першую чаргу сярод хрысціянскіх супольнасцей, супраць правоў ЛГБТІ, абортаў, ЭКА і праграм прафілактыкі інфекцый, што перадаюцца палавым шляхам. Да канца года яны сабралі 30 000 подпісаў пад зваротам, які заклікае да крыміналізацыі распаўсюду інфармацыі пра гомасэксуальнасць. У той жа час неліберальная ініцыятыва «Несмяротны полк» знізіла сваю актыўнасць у 2019 годзе і атрымала адмову ў рэгістрацыі ў форме грамадскага аб'яднання.

Анлайнавы актывізм становіцца ўсё больш папулярнай формай грамадзянскага ўдзелу для беларусаў, збольшага таму, што іншыя магчымасці і механізмы неэфектыўныя і іх цяжка выкарыстоўваць. Паводле апытання, праведзенага праваабарончай арганізацыяй Human Constanta і Baltic Internet Policy Initiative сярод беларускіх інтэрнэт-карыстальнікаў, 48% рэспандэнтаў выкарыстоўвалі інтэрнэт для ўдзелу ў супольнасці з падобнымі інтарэсамі, 35% – для ўдзелу ў дыскусіі, 20% – каб падпісаць анлайн-петыцыю. Паводле даследавання Офіса еўрапейскай экспертызы і камунікацый і Baltic Internet Policy Initiative «Грамадскія арганізацыі і грамадзянскія ініцыятывы: патэнцыял удзелу», больш за 60% рэспандэнтаў гатовыя ўдзельнічаць у працэсе вырашэння актуальных праблем сваёй мясцовай супольнасці шляхам падпісання петыцый. У 2019 годзе на платформе Petitions.by было створана 709 петыцый. Папулярнасць платформы дазволіла ёй забяспечваць сваю дзейнасць за кошт ахвяраванняў карыстальнікаў.

Беларускія АГС не прымаюць шырокага ўдзелу ў адвакатаванні на карысць больш спрыяльных прававых умоў для сектара. Толькі некалькі арганізацый грамадзянскай супольнасці, у тым ліку Цэнтр прававой трансфармацыі, Асамблея НДА і Міжнароднае асветніцкае грамадскае аб'яднанне «АКТ», прынялі ўдзел у грамадскім абмеркаванні праекта змен у Закон «Аб грамадзкіх аб'яднаннях», які Савет Міністраў накіраваў у парламент напрыканцы 2019 года. У чэрвені 25 некамерцыйных устаноў накіравалі калектыўны зварот у Савет Міністраў аб ліквідацыі неабгрунтаваных адлічэнняў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.

## АКАЗАННЕ ПАСЛУГАЎ: 5.0 (2018: 5.0)

Аказанне паслугаў беларускімі арганізацыямі грамадзянскай супольнасці не змянілася ў 2019 годзе. Сектар АГС працягвае аказваць шырокі спектр паслугаў у такіх сферах, як сацыяльнае абслугоўванне, грамадзянская адукацыя, абарона навакольнага асяроддзя, рэгіянальнае развіццё, прававая дапамога,

АКАЗАННЕ ПАСЛУГАЎ У БЕЛАРУСІ




развіццё патэнцыялу сектара. Аднак асартымент, ахоп і эфектыўнасць паслугаў АГС не з'яўляюцца ўстойлівымі, паколькі большасць арганізацый залежаць ад фінансавання міжнародных донараў і зазвычай не могуць аказваць паслугі ўсім, хто мае ў іх патрэбу.

АГС, асабліва тыя, што займаюцца адукацыйнай і інфармацыйнай дзейнасцю, паспяхова пашырылі спектр сваіх паслугаў для розных мэтавых груп. Напрыклад, Рэспубліканская асацыяцыя інвалідаў-калясачнікаў запусціла вэб-сайт Mamapapa.by, дзе людзі з траўмай спіннога мозгу, якія хочуць стаць бацькамі, могуць знайсці інфармацыю і атрымаць кансультацыю па пытаннях сэксуальнасці, фертыльнасці і рэпрадуктыўнага здароўя. АГС Human Constanta і «Прававая ініцыятыва» праводзілі гарадскія квэсты і паб-квізы па правах чалавека. На працягу года некалькі арганізацый і груп актывістаў запусцілі свае падкасты, такія як FemFM, Dzigital і «Мы не дагаварылі!». Усё больш АГС праводзяць дыстанцыйныя і змешаныя адукацыйныя курсы. Напрыклад, Школа маладых менеджэраў публічнага адміністравання (SYMPA) у 2019 годзе абвясціла набор на анлайн-курс «Сучасныя тэорыі і практыкі дзяржаўнага кіравання і публічнай палітыкі», а Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый правёў анлайн-курс па стварэнні мясцовых супольнасцей.

Многія АГС імкнуцца вызначыць патрэбы сваіх кліентаў і мэтавых груп, каб прапаноўваць ім адпаведныя паслугі або пераарыентаваць ужо існуючую дзейнасць, падвысіўшы яе эфектыўнасць. Аднак ацэнка патрэбаў, як правіла, праводзіцца нефармальным і несістэматычным чынам. Паколькі большасці АГС не хапае кампетэнцый у зборы і ацэнцы дадзеных, толькі нешматлікія арганізацыі могуць прадэманстраваць свой унёсак у вырашэнне мясцовых праблем.

Беларускія АГС прапануюць паслугі не толькі сваім сябрам і прыхільнікам, але і шырокаму колу іншых мэтавых груп. У студзені Прэс-клуб Беларусь запусціў маніторынг Media IQ, падчас якога фіксаваліся парушэнні журналісцкіх стандартаў і выпадкі прапаганды і маніпуляцый у медыя. Цэнтр экалагічных рашэнняў дае кансультацыі кампаніям, якія хочуць распрацаваць экалагічную палітыку. Акадэмікі і дзяржаўныя чыноўнікі выкарыстоўваюць экспертызу незалежных даследчых цэнтраў. Спецыялісты з дзяржаўных

установаў рэгулярна бяруць удзел у мерапрыемствах і праходзяць навучанне ў АГС, якія аказваюць сацыяльныя паслугі.

Зазвычай АГС наўмысна не дыскрымінуюць прадстаўнікоў тых ці іншых груп пры аказанні сваіх паслугаў і прапанове сваіх прадуктаў, але існуюць выпадкі несвядомай дыскрымінацыі. Многія арганізацыі маюць офісы ў будынках ці арганізуюць мерапрыемствы ў памяшканнях, дзе не створана безбар'ернае асяроддзе, а інфармацыя пра паслугі АГС не заўсёды даступная ўсім групам грамадства. На працягу 2019 года АГС часцей абмяркоўвалі ўкараненне недыскрымінацыйных падыходаў да дзейнасці, інклюзіўныя практыкі і прасоўванне скразных каштоўнасцей.

Усё больш АГС спрабуюць пакрыць выдаткі на аказанне паслугаў, беручы плату за ўдзел у сваіх мерапрыемствах і складаючы дамовы на аказанне паслугаў, але гэтыя сумы, як правіла, не пакрываюць асноўную частку расходаў арганізацый. Такія АГС галоўным чынам зарэгістраваныя як установы; грамадскім аб'яднанням займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю забаронена.

Попыт з боку дзяржаўных органаў на экспертызу і паслугі АГС, напрыклад, аналіз незалежных даследчых цэнтраў, ацэнкі экалагічных АГС і навучанне спецыялістаў сацыяльнай сферы, расце. У снежні Цэнтр «Трэці сектар» атрымаў падзяку ад Міністэрства працы і сацыяльнай абароны за працу па развіцці валанцёрства і рэалізацыі сацыяльна значных праектаў. Аднак прызнанне і ацэнка ўрадам унёску АГС усё яшчэ вельмі абмежаваныя.

## ІНФРАСТРУКТУРА СЕКТАРА: 5.0 (2018: 5.0)

Інфраструктура сектара АГС не зведала істотных змен у 2019 годзе. Нягледзячы на тое, што арганізацыі грамадзянскай супольнасці маюць доступ да розных паслугаў падтрымкі, на канец года ў Беларусі не дзейнічала ніводная доўгатэрміновая комплексная праграма, даступная для розных відаў АГС.




Некалькі актыўных і дасведчаных пасрэдніцкіх арганізацый падтрымкі, сетак АГС і парасонавых арганізацый даюць магчымасці для навучання, кансультацыі, інфармацыйную і тэхнічную падтрымку грамадскім

арганізацыям і ініцыятывам. Сярод іх Асамблея НДА, фонд «Новая Еўразія», ОДБ Брусель, Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый, Беларускі нацыянальны моладзевы савет РАДА. Такія арганізацыі, як Агенцтва рэгіянальнага развіцця «Дзедзіч» у Бресце, Цэнтр «Трэці сектар» у Гродне і Цэнтр «Кола» ў Магілёве, служаць рэсурснымі цэнтрамі для АГС і актывістаў у адпаведных рэгіёнах. Інфраструктурныя арганізацыі працягваюць залежаць ад замежнага фінансавання і таму маюць абмежаваны аб'ём, ахоп і магчымасці для аказання паслугаў; размешчаны яны галоўным чынам у буйных гарадах. Зазвычай арганізацыі падтрымкі аказваюць паслугі бясплатна, хоць некаторыя з іх збіраюць невялікія ўнёскі (ад 5 да 10 долараў) з удзельнікаў адукацыйных праграм.

Напрыканцы 2018 года ў Мінску адкрылася новая прастора «Тэрыторыя правоў», дзе праваабарончыя і іншыя прадэмакратычныя АГС у 2019 годзе правялі больш за 170 мерапрыемстваў. Наяўнасць бясплатнай і даступнай пляцоўкі паслужыла каталізатарам з'яўлення некаторых новых ініцыятыў АГС. Напрыклад, кожны панядзелак Валанцёрская служба Праваабарончага цэнтра «Вясна» праводзіла на пляцоўцы сустрэчы клуба англійскай мовы па правах чалавека.

Некаторыя беларускія АГС у межах буйных праектаў пераразмяркоўваюць сродкі замежных донараў сярод мясцовых арганізацый грамадзянскай супольнасці. У 2019 годзе Беларускі Дом правоў чалавека падтрымаў дзесяткі малых, буйных і даследчых праектаў, накіраваных на прасоўванне правоў чалавека і дэмакратычных каштоўнасцей. Прадстаўніцтва DVV International у Беларусі пераразмяркоўвала сродкі Міністэрства замежных спраў Германіі на падтрымку праектаў па пашырэнні доступу да адукацыі ў пенітэнцыярнай сістэме. Офіс па правах людзей з інваліднасцю пры падтрымцы Еўрасаюза фінансаваў міні-праекты, накіраваныя на развіццё самастойнага жыцця людзей з інваліднасцю. Беларускія бізнесмены і кампаніі ў межах 14-га сезона конкурса Social Weekend падтрымалі сацыяльныя праекты на больш чым 50 000 долараў ЗША.

Арганізацыі грамадзянскай супольнасці маюць доступ да пула прафесійных экспертаў, кансультантаў і трэнераў у сферы менеджменту АГС і фандрэйзінга. У красавіку 2019 года 27 прадстаўнікоў АГС завяршылі паглыблены шасцімесячны курс «Менеджмент НКА», арганізаваны Фондам «Новая Еўразія» і Інстытутам бізнесу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. На працягу года праходзілі трэнінгі і навучальныя курсы па такіх спецыялізаваных тэмах дзейнасці АГС, як сторытэлінг або некамерцыйнае права. Аднак

існуючыя адукацыйныя праграмы не адпавядаюць усім патрэбам сектара. АГС, асабліва новыя, не маюць базавай падрыхтоўкі па пытаннях кіравання, бухгалтарскага ўліку, фінансавага менеджменту, маніторынга і ацэнкі. У той жа час дасведчаным менеджэрам АГС не хапае магчымасцей для спецыялізаванага навучання сучасным падыходам да кіравання, камунікацыям, адвакатаванню, выкарыстанню ІКТ для развіцця грамадзянскага актывізму і прыцягнення сродкаў.

У сектары АГС працягваюць развівацца супрацоўніцтва і партнёрства. У 2019 годзе АГС аб'ядноўваліся ў кааліцыі для арганізацыі мерапрыемстваў, такіх як Idea Generation Camp і Zero Discrimination Day; дзяліліся адзін з адным інфармацыяй і планамі праз чаты і групы ў сацыяльных сетках, на спецыяльных сустрэчах і нэтворкінг-мерапрыемствах; рэалізоўвалі сумесныя праекты; разам працавалі над адвакатыўнымі кампаніямі. Шэсць АГС, якія займаюцца праблемамі ЛГБТ-супольнасці, сфармавалі кааліцыю для каардынацыі стратэгій дзейнасці і прасоўвання агульнага парадку.

У 2019 годзе АГС развівалі міжсектарныя партнёрствы, галоўным чынам з прыватным сектарам і СМІ. Летам дзякуючы супрацоўніцтву Асамблеі НДА і арганізатараў музычнага фестываля Viva Braslav 11 АГС прэзентавалі сваю працу наведвальнікам фестываля на «Пляцоўцы сацыяльнай актыўнасці». У межах лабараторыі для актывістаў IdeaLab эксперты з медыя і крэатыўных агенцтваў дапамаглі АГС распрацаваць медыя-кампаніі для павышэння пазнавальнасці арганізацый і бачнасці праблем, з якімі яны працуюць. Цэнтр гарадскіх ініцыятыў, Магілёўскі гарадскі выканаўчы камітэт і кампанія «Аліварыя» правялі Вялікі гарадскі пікнік у Магілёве. Як і ў папярэднія гады, дзяржаўныя чыноўнікі высокага ўзроўню рэгулярна ўдзельнічалі ў мерапрыемствах грамадзянскай супольнасці. АГС і мясцовыя органы ўлады рэалізоўвалі сумесныя праекты, галоўным чынам накіраваныя на наладжванне інфраструктуры і рэгіянальнае развіццё. Тым не менш, узаемадзеянне АГС з бізнесам і дзяржаўнымі органамі па-ранейшаму залежыць у першую чаргу ад асабістых кантактаў.

## ГРАМАДСКІ ІМІДЖ: 5.4 (2018: 5.4)

Грамадскі імідж сектара АГС у 2019 годзе істотна не змяніўся. АГС працягнулі інтэнсіўна развіваць уласныя каналы камунікацый у сацыяльных медыя і прыцягваць грамадскую ўвагу за кошт арганізацыі масавых мерапрыемстваў і крэатыўных акцый. У прызнанні АГС з боку ўладаў і бізнесу не адбылося прыкметных прарываў.

ГРАМАДСКІ ІМІДЖ У БЕЛАРУСІ




На працягу года незалежныя СМІ асвятлялі шырокі спектр тэм, якія датычацца грамадзянскай супольнасці, у тым ліку ўдзел актывістаў у адвакатыўных кампаніях і пратэстных акцыях. Найбуйнейшы партал навін TUT.BY публікаваў серыю артыкулаў пра дасягненні беларускіх АГС; анлайн-часопіс CityDog працягнуў рэгулярную рубрыку Grassroots аб ініцыятывах АГС і магчымасцях удзелу грамадзян у дзейнасці грамадскіх арганізацый і праектаў. Дзяржаўныя медыя, у сваю чаргу, аддавалі перавагу тэмам, звязаных з лакальным актывізмам па добраўпарадкаванні тэрыторый. Так, тэлеканал АНТ паказваў серыю сюжэтаў пра мясцовых актывістаў і іх ініцыятывы ў мястэчках.

Расійскія прапагандысцкія медыя публікавалі фэйкавыя навіны і матэрыялы, якія дыскрэдытуюць беларускую грамадзянскую супольнасць. Некаторыя беларускія Тэлеграм-каналы і блогеры таксама распаўсюджвалі негатыўныя звесткі пра актывістаў АГС.

Узровень паінфармаванасці грамадзян аб АГС і ўдзелу ў іх дзейнасці застаецца невысокім. Згодна са штогадовым нацыянальным апытаннем, праведзеным па замове некамерцыйнай арганізацыі Pact, у 2019 толькі 3% беларусаў прымалі ўдзел у дзейнасці АГС; такі ж паказчык быў у 2018 годзе. Пры гэтым паінфармаванасць грамадзян аб АГС трохі вырасла за год з 26% да 32%. У рэйтынгу паінфармаванасці перадавыя пазіцыі занялі дабрачынныя, моладзевыя, экалагічныя арганізацыі і таварыствы абароны жывёл. Беларускія карыстальнікі інтэрнэта ў большай ступені дасведчаныя і ўдзельнічаюць у дзейнасці АГС. Паводле апытання інтэрнэт-аўдыторыі, праведзенага Baltic Internet Policy Initiative і Офісам еўрапейскай экспертызы і камунікацый, 20% рэспандэнтаў удзельнічаюць у дзейнасці грамадскіх арганізацый і ініцыятыў, 71% ведаюць пра іх дзейнасць.

Хоць фактычны ўзровень удзелу ўсё яшчэ нізкі, беларусы патэнцыйна гатовы ўдзельнічаць у дзейнасці АГС і іншых формах грамадзянскай актыўнасці. Так, згодна са згаданым вышэй апытаннем Pact, 28% беларусаў гатовыя ўдзельнічаць у дзейнасці АГС, 46% – у грамадска карыснай дзейнасці і 52% – у вырашэнні праблем сваіх мясцовых супольнасцей. Сярод галоўных прычын грамадзянскай пасіўнасці рэспандэнтаў – недахоп інфармацыі аб магчымасцях удзелу і адсутнасць веры ў магчымасць змен.

У 2019 годзе АГС арганізавалі мноства масавых фестываляў і канферэнцый для ўключэння беларусаў у грамадскую дзейнасць і прасоўвання актывізму ў якасці «моднага канцэпта». Напрыклад, Мінскае веласіпеднае таварыства арганізавала карнавал Viva Rovar!, Асамблея НДА правяла фестываль «Кіламетр грамадскай актыўнасці», а ініцыятыва «EdCamp Беларусь» – III міжнародную (не) канферэнцыю для школьных настаўнікаў.

Успрыманне ўрадам сектара АГС не змянілася ў 2019 годзе. Чыноўнікі рознага ўзроўню працягвалі наведваць мерапрыемствы, якія ладзілі АГС. Другі год запар прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка браў удзел у форуме па еўрапейскай бяспецы, арганізаваным няўрадавым Саветам па міжнародных адносінах «Мінскі дыялог». Але, як і раней, ініцыятыва да супрацоўніцтва ішла хутчэй не ад дзяржорганаў, а ад АГС.

Як і ў папярэднія гады, бізнес-кампаніі давяраюць пэўнаму колу АГС, але не разглядаюць сектар у цэлым як партнёра для сумесных мерапрыемстваў, адвакатавання або працы з уразлівымі групамі. Як паказала даследаванне кампаніі Civitta / SATIO і Фонда «Добра» на тэму рынка КСА ў Беларусі, па-ранейшаму прыярытэтным напрамкам для бізнесу з’яўляецца не падтрымка АГС, а дабрачыннасць, то бок наўпроставая дапамога ўразлівым катэгорыям насельніцтва. Пры гэтым кампаніі не падтрымліваюць тэмы, звязаныя з палітыкай ці патэнцыйным канфліктам з уладамі, і часам уступаюць у супрацьстаянне з АГС, асабліва з экалагічнымі актывістамі.

У 2019 годзе АГС працягнулі нарошчваць сваю прысутнасць у інфармацыйнай прасторы, у тым ліку ў традыцыйных медыя, сацыяльных сетках, Telegram і Youtube, падкастах, каб распавядаць пра сваю дзейнасць і прасоўваць сацыяльна важныя тэмы. Акрамя таго, для прыцягнення медыйнай і грамадскай увагі АГС выкарыстоўвалі крэатыўныя акцыі і інструменты. Ініцыятыва «Маршыруй, дзетка!» у снежні 2019 года выставіла на цэнтральнай плошчы Мінска дзесяткі пар аранжавага абутку, якая рэпрэзэнтуюць пацярпелых ад хатняга гвалту. Першы інклюзіўны серыял «Хто, калі не мы» прадставіў у якасці галоўных герояў людзей з інваліднасцю, якія самастойна вырашаюць штодзённыя праблемы; серыял быў створаны актывістам з інваліднасцю пры падтрымцы USAID. Усё большую ролю ў актуалізацыі грамадскага парадку пачынаюць граць незалежныя блогеры, якія становяцца часткай грамадзянскай супольнасці.

Для павышэння бачнасці сектара АГС праводзяць штогадовыя цырымоніі ўзнагароджання лепшых грамадскіх арганізацый і ініцыятыў. Сярод іх прэміі «Чэмпіёны грамадзянскай супольнасці» і «Зрабілі», моладзевая

прэмія Rada Awards, узнагароджанні рэгіянальных актывістаў у Віцебску і Брэсце.

Тым не менш, АГС па-ранейшаму не хапае сістэмнага падыходу да прасоўвання свайго іміджу, і нешматлікія арганізацыі прыцягваюць прафесіяналаў для кіравання сваёй дзейнасцю па сувязях з грамадскасцю. Большасць АГС не маюць дастатковага патэнцыялу для стварэння цікавых інфанагод, узаемадзеяння з аўдыторыяй ў сацыяльных сетках або рэагавання на канфлікты, якія выходзяць у публічную сферу.

АГС у большай ступені разумеюць важнасць празрыстасці і адкрытасці, аднак гадавыя справаздачы публікуюць вельмі нешматлікія арганізацыі, а справаздачы аб фінансах не выдае амаль ніхто. Нягледзячы на паглыбленне дыскусіі пра каштоўнасці АГС, агульны этычны кодэкс сектара да гэтага часу не прыняты, і спробаў яго распрацоўкі ў 2019 годзе не назіралася.

**U.S. Agency for International Development**

1300 Pennsylvania Avenue, NW
Washington, DC 20523
Tel: (202) 712-0000
Fax: (202) 216-3524

**www.usaid.gov**